

з 1 студзеня вызваляюцца ад падаходнага падатку даходы, атрыманыя ад фізічных асоб, што не з'яўляюцца ІП, у выглядзе дарэння пры ўмове, калі такія даходы ў агульнай суме не перавышаюць 33 100 000 рублёў.

СТАР 2



Экзатычныя рыбкі гара руфа дапамогуць віцебскім дэрматолагам праводзіць лячэнне захворванняў скуры. Медыкі ўпэўнены, што так званая фіш-тэрапія будзе карыстацца вялікім попытам.

СТАР 3



Пісьменнік, драматург, публіцыст, літаратуразнавец, перакладчык, крытык, фальклargыст, мовазнавец, гісторык. І ўсё гэта ён — Максім Гарэцкі.

СТАР 5

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 ЛЮТАГА 2013 г. СУБОТА № 31 (27396) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ЧАСУ НА РАЗВАРУШВАННЕ НЯМА

**Аляксандр Лукашэнка патрабуе паскорыць будаўніцтва беларускіх аб'ектаў у Сочы і Краснай Паляне.**

Прэзідэнт Беларусі, які знаходзіцца з рабочым візітам у Расійскай Федэрацыі, азнаёміўся з перспектывамі завяршэння будаўніцтва аб'ектаў інфраструктуры санаторыя «Беларусь» у Сочы і комплексу адпачынку гэтага санаторыя ў пасёлку Красная Паляна, паведамілі БелТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік спраў Прэзідэнта Віктар Шэйман далажыў кіраўніку дзяржавы аб тым, што плануецца зрабіць на гэтых аб'ектах, каб яны максімальна прыносілі прыбытак дзяржаве.

«Пытанне адно: нам трэба завяршыць пачатую справу, завяршыць усе гэтыя будоўлі. Трэба зрабіць усё, каб санаторый у Сочы прывесці ў парадак», — сказаў Прэзідэнт.

«Што датычыцца Краснай Паляны, то часу ў нас на разварушванне практычна няма. У прынцыпе, задача была пастаўлена даўно, і вы павінны былі думаць, што тут зрабіць такім чынам, каб гэты аб'ект прыносіў грошы. Але самыя вялікія грошы — гэта Алімпійскія гульні, якія будуць праходзіць тут роўна праз год», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ўжо сёння беларускія аб'екты прыносяць нядрэнны прыбытак, гасцініца размешчана ў ідэальным месцы і карыстаецца вялікім попытам. «Але палавіна той зямлі, якую расіяне адвялі нам тут для будаўніцтва, яшчэ свабодна. Таму трэба падумаць, што мы тут будзем рабіць. Тэрыторыя тут — а гэта лепшае ў Краснай Паляне — павінна быць узорна-паказальнай, як усе аб'екты ў Беларусі. У ідэальным стане, нават калі нам трэба будзе прывесці ў парадак пад'язныя дарогі, якія сюды ідуць непасрэдна ад цэнтральнай трасы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## КРАІНА АДДАЕ ДАНІНУ ПАВАГІ СВАІМ СЫНАМ — ВОІНАМ-ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТАМ





Учора ў Мінску, на Востраве мужнасці і смутку, адбылася ўрачыстая цырымонія ўскладання вянкоў і кветак да помнікаў воінам-інтэрнацыяналістам. Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Радзькоў агучыў удзельнікам мітынгу прывітанне Прэзідэнта краіны. Фота БЕЛТА.





## ЗВАНЫ ЛЬЮЦЦА ПЕСНЯЙ ЧЫСТАЙ

**Больш як 100 розных званоў сабрана ў калекцыі намесніка начальніка Мазырскага РАУС, падпалкоўніка Сяргея Кадолы. У ліку ўнікальных экспанатаў — царкоўныя званы, званы для рачных і марскіх суднаў, званочкі ямскія паддужныя, настольныя, падарачныя, сувенірныя, бразготкі, балабон для жывёлы і нават навагоднія. Фота БЕЛТА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ПІНЕВІЧ, першы намеснік міністра аховы здароўя:**

***«Прапанова Міністэрства аховы здароўя аб дазволе выдачы лісткоў непрацаздольнасці прыватнымі арганізацыямі аховы здароўя была падтрымана Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны. Сёння гэтае пытанне прапрацоўваецца ў Міністэрстве аховы здароўя, і ў далейшым будзе ажыццёўлена карэкціроўка адпаведных нарматыўных прававых актаў. Такая ініцыятыва ведамства была выклікана шматлікімі зваротамі грамадзян і прыватных арганізацый аб паляпшэнні даступнасці і якасці медыцынскай дапамогі. Акрамя таго, Міністэрства аховы здароўя ініцыюе ўвядзенне аплаты трох першых дзён часовай непрацаздольнасці за кошт наймальніка са зменай пры гэтым аб'ёму адлічэнняў ім у Фонд сацыяльнай абароны Мінпрацы і сацабароны».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.02.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8610,00 | ▼ |
| Еўра | 11510,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 286,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1058,19 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | – 1° |
| Віцебск | – 5° |
| Гомель | – 2° |
| Гродна | – 2° |
| Магілёў | – 4° |
| Мінск | – 5° |

## «ПРАЦЭС НАВУЧАННЯ Ў АЎТАШКОЛАХ ПАВІНЕН ЛЕПШ КАНТРАЛЯВАЦЦА»

**Такую думку выказаў на прэс-канферэнцыі намеснік Генеральнага пракурора Беларусі Аляксей СТУК. Акрамя таго, ён адказаў на пытанні журналістаў, звязаныя з гучнымі судовымі справамі і прымяненнем смяротнага пакарання.**



### ПРА КАНФІСКАЦЫЮ

Як паведамлялася раней, Генпракуратура выступіла з заканадаўчай ініцыятывай, якая тычыцца ўзмацнення адказнасці ў дачыненні да п'яных кіроўцаў.

— Праект закона, які тычыцца п'яных кіроўцаў, знаходзіцца на стадыі канчатковай дапрацоўкі, — адзначыў Аляксей Стук. — Мы ўлічваем апошнія прапановы. Яны звязаны з выключэннем пэўных відаў транспарту, якія знаходзяцца ва ўласнасці юрыдычных асоб, са спісу тых, што будуць падлягаць канфіскацыі. Засталося дапрацаваць гэты момант, і мы будзем гатовы прадставіць законапраект на разгляд кіраўніку дзяржавы. Мы прытрымліваемся думкі аб неабходнасці канфіскацыі аўтамабіля ў п'яных кіроўцаў незалежна ад права ўласнасці. Выступаем за тое, каб, калі ў выніку ДТЗ па віне нецвярозага кіроўцы гінуць людзі альбо ім наносяцца цяжкія цялесныя пашкоджанні, прадугледжвалася ўзмоцненая крымінальная адказнасць ажно да пазбаўлення волі. Закон, якія дзейнічае цяпер, не прадугледжвае пазбаўлення волі за кіраванне ў нецвярозым стане.

### ПРА АЎТАШКОЛЫ

Падзяліўся Аляксей Стук са «Звяздой» і сваім бачаннем адносна новаўвядзенняў, якія хочуць увесці ў дачыненні да аўташкол — у прыватнасці, абсталявання вучэбных машын відэарэгістратарамі і сістэмамі GPS-пазіцыянавання, якія дазвалялі б адсочваць ход практычнага навучання кіраванню, павелічэння ў праграмах падрыхтоўкі кіроўцаў колькасці гадзін практычнага ваджэння, увядзенне ліміту на колькасць пераздач у ДАІ:

— Гэтыя і іншыя пытанні цяпер разглядае кваліфікаваная рабочая камісія, і да якога выніку яна прыйдзе, цяжка сказаць. Я думаю, што працэс навучання ў аўташколах сапраўды павінен лепш кантралявацца, прычым больш жорстка. Бо шмат нараканняў сёння паступае ад работнікаў ДАІ на падрыхтоўку людзей, якія прыходзяць здаваць кваліфікацыйныя іспыты. Палова выпускнікоў аўташкол не здае іх з першай спробы. Самы нізкі працэнт здачы ў ДАІ сярод выпускнікоў аўташкол ў Мінску. Таму мы лічым, што кандыдат у кіроўцы, які не здаў практычны іспыт з трэцяга разу, павінен прайсці дадатковы курс практычнага кіравання ў аўташколе.

Акрамя таго, Аляксей Стук распавёў, што падчас пракурорскіх праверак устаноўлены шматлікія парушэнні пры падрыхтоўцы кіроўцаў у аўташколах. У прыватнасці, на практычных занятках дапускаюцца адступленні ад вучэбных праграм, скарачэнне часу, адведзенага на навучанне практычнаму ваджэнню.

— На наш погляд, 40 гадзін практычнага ваджэння, прадугледжаных праграмай, з якіх толькі 8 гадзін адведзена на ваджэнне па гарадскіх дарогах з інтэнсіўным рухам, не дазваляюць будучым кіроўцам атрымаць дастатковыя навыкі для бяспечнага ўдзелу ў дарожным руху, — адзначыў намеснік Генпракурора. — У выніку найбольшая колькасць ДТЗ здзяйсняецца вадзіцелямі са стажам кіравання да 1 года.

У сувязі з гэтым прапаноўваецца разгледзець пытанне аб выдачы выпускнікам аўташкол часовага пасведчання кіроўцы, якое прадугледжвала б шэраг абмежаванняў на двухгадовы выпрабавальны тэрмін: абмежаванне хуткасці руху, забарона перавозкі пасажыраў, забарона на кіраванне ў начны час сутак.

СТАР. 2

## КОРАТКА

У 2012/2013 годзе ў школах на беларускай мове вывучаюць усе прадметы больш 151 тыс. навучэнцаў, што складае 16,4% усіх школьнікаў.

Савет дырэктараў ААТ «Уралкалій» адобрыў заснаванне сумеснага з ААТ «Беларуськалій» трэйдара калійных угнаенняў Soyuzkali GmbH («Саюзкалій»). Расійска-беларуская кампанія будзе зарэгістравана ў Швейцарыі. Доля «Уралкалія» ў статутным капітале сумеснай кампаніі складзе 50%.

У 2012 годзе лячэнне ў Беларусі прайшлі 130 тыс. замежнікаў са 170 краін свету.

Беларускай чыгункай часова прыпынена рэалізацыя білетаў на міжнародныя пасажырскія паязды ў зносінах з Украінай з 30 сакавіка. Гэта выклікана тым, што ў суседняй краіне пакуль не вызначыліся з прыняццем рашэння аб пераходзе на летні час.

## ПРАМАЯ ЛІНІЯ: ВЫ І НОВАЯ ПРАЦА

Уладкоўваецеся на новую працу? Ёсць пытанні? Хочаце быць у курсе, якія нюансы існуюць пры заключэнні працоўнага дагавора?

**У аўторак, 19 лютага, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Ігар Рыгоравіч СТАРАВОЙТАЎ** правядзе прамую тэлефонную лінію на тэму «Прыём на працу, заключэнне працоўнага дагавора».

Тэлефануйце і задавайце свае пытанні з **11.00 да 12.00 гадзін** па тэлефоне **306-37-95**.

■ Удар з космасу

## «ПРАДБАЧЫЦЬ З'ЯЎЛЕННЕ МЕТЭАРОІДА БЫЛО НЕМАГЧЫМА»

### Над Уралам выбухнуў нечаканы «госць» з космасу

**Калі чытаеш паведамленні, глядзіш фотаздымкі і асабліва відэа — робіцца неяк ніякавата. Вялікі вогненны шар, падаецца, ляціць проста на аўтамабіль, з якога вядуцца здымкі... Нязвыкла вялізны шлейф у небе... Успышка, моцныя выбухі... Тое, што шмат разоў з галівудскім размахам паказвалі нам на экране, адбылося наяве. Пераажыць гэты жах выпала жыхарам некалькіх расійскіх гарадоў: над Чалябінскай вобласцю ўзарваўся метэароід...**



На момант падрыхтоўкі гэтага матэрыялу гаварылася пра 550 пацярпелых. У мароз без шкла засталося каля 300 дамоў, у некаторых абваліліся дахі. Вокны павыбівала таксама ў 12 школах і трох бальніцах, 16 сацыяльных аб'ектах. Былі паабрываны правады ліній электраперадач, не працавала мабільная сувязь...

У самім Чалябінску выбухі прагрымелі ў Ленінскім раёне, а таксама каля трактарнага завода. Кавалак нябеснага аб'екта ўпаў на дах трубапракатнага завода, яшчэ адзін разбурыў частку сцяны цынкавага завода. Паведамлялася пра тое, што часткова абрынуўся дах атэля... У горадзе была праведзена частковая эвакуацыя. Паліцыя перайшла на ўзмоцнены рэжым нясення службы, быў уведзены план «Крэпасць». Усе стратэгічныя і жыццёва важныя аб'екты Чалябінска былі ўзяты пад дадатковую ахову. Па першаснай інфармацыі, падзенне нейкіх аб'ектаў назіралі і ў Свярдлоўскай вобласці.

Паводле інфармацыі, якая была вядомай на момант падрыхтоўкі публікацыі, гучалі меркаванні, што ўзарваўся каменны метэароід або міні-камета. Мяркуецца, што нябеснае цела магло быць дыяметрам больш за 10 метраў. Вышынёй выбуху называліся 43-47 кіламетры.

Міністэрства абароны Расіі быццам бы ведала пра набліжэнне да Зямлі касмічнага цела. Аднак ваенныя, маючы папярэднія даныя пра яго састаў і памеры, палічылі, што аб'ект згарыць у атмасферы. Таму і падстаў для трывогі ніякіх не было...

ISSN 1990 - 763X

**З просьбай пракаментаваць падзеі на Урале мы звярнуліся да дырэктара абсерваторыі БДУ Альгерда Кузнечыка.**

***— На вашу думку, што ж адбылося ў небе над уральскімі гарадамі, а потым і на зямлі?***

— Можна меркаваць, што ў паветры ўзарваўся метэароід. Метэарыт — гэта тое, што ўжо знаходзіцца на зямлі, а калі ў паветры — метэароід. Унутры яго былі газы, і метэароід разарвала. У залежнасці ад дыяпазонавых памераў метэароіды падзяляюцца на баліды і астэроіды. У балідаў у касмічных целаў таксама існуе класіфікацыя. Таму дакладна сказаць, што гэта было за касмічнае цела, можна будзе толькі пасля таго, як яго асноўны кавалак дастануць з возера, куды, як я чытаў, ён упаў, і даследуюць. Але ўжо можна сказаць, што памер метэароіда быў немалым. Адносна дробныя касмічныя целы, уваходзячы ў атмасферу, выпадаюць «дажджом», які згарае на вышыні ад 120 да 80 кіламетраў.

***— Ольгерд Паўлавіч, можна меркаваць, які метэароід быў па сваім саставе? Ведаючы гэта, можна будзе, напэўна, патлумачыць і маштаб разбурэнняў...***

— Думаю, жалезанікелевы. Але каб дакладна гэта гаварыць, трэба правесці спектральны аналіз яго абломкаў, што ўпалі на зямлю. З іншага боку, я не адмаўляю, што гэтым касмічным целам мог быць аб'ект і штучнага паходжання: дэталь ад ракеты, умоўна кажучы, ад касмічнай станцыі. Не ад цяперашняй МКС, а з разраду касмічнага смецця.

Калі гаварыць пра найбольшую небяспеку ад касмічных целаў, дык яе ўяўляюць якраз жалезныя або жалезанікелевыя метэароіды. Напрыклад, у каменным касмічным целе ёсць поры, значыць, за кошт гэтага такі метэароід будзе мець зусім іншую вагу, чым два вышэйназваныя. Яшчэ большую небяспеку ўяўляюць найперш каметы, паколькі ёсць істотнае адрозненне ў ядрах. У каметы яно выдзяляе шмат розных газаў, якія ўспыхваюць. І ўрон ад каметы будзе яшчэ большым, калі яна ўзарвецца ў паветры.

***— Ці можна было прадбачыць падзенне метэароіда?***

— Прадбачыць, на жаль, не. Гэта яшчэ пакуль не ўяўляецца магчымым, прынамсі, вельмі дакладна. Чаму? Мы гаворым пра сур'ёзную праблему. Астэроідна-каметная небяспека абмяркоўвалася ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, у палаце лордаў Вялікабрытаніі, у кангрэсе ЗША, былі выдзеленыя сродкі на рашэнне гэтай праблемы. Як толькі гэта адбылося, у ЗША з 1998 года запрацавала праграма «Касмічная варта — 1». Яе мэта — выяўленне касмічных целаў памерамі ад аднаго кіламетра і больш, вызначэнне іх арбіт і ўнясенне ў каталогі. Да 2008 года гэтая праца была зроблена. Мэтай «Касмічнай варты — 2» было выяўленне ўжо касмічных целы памерамі ад 300 метраў да аднаго кіламетра. У наступнай праграмы, трэцяй, якая плануецца, патрабаванні будуць такімі: знайсці касмічныя цела памерамі ад 100 — 300 метраў. У выпадку падзення на Зямлю касмічнага цела памерам 100 і больш метраў адбудзецца рэгіянальная катастрофа (менавіта падзення аб'екта названых памераў, а не набліжэння да планеты, бо некаторыя памылкова лічаць, што калі касмічнае цела такіх памераў будзе набліжацца, дык пачне згараць і маштаб катастрофы будзе іншым). Калі ўпадзе аб'ект памерам ад аднаго кіламетра і больш — гэта будзе глабальнай катастрофай. Калі памеры складуць 10 кіламетраў — надыдзе канец цывілізацыі.

***— Агучана версія, што метэароід, які абрынуўся на Урал, — гэта асколак астэроіда 2012 DA14, які ў пятніцу ўвечары павінен прайсці побач з Зямлёй...***

— Астэроід 2012 DA14 праляціць на адлегласці ў 27,7 тысячы кіламетраў ад паверхні Зямлі. Гэта ў дзесяць разоў менш, чым адлегласць ад Зямлі да Месяца. Названы астэроід стане першым такога памеру, які пройдзе настолькі блізка ад нашай планеты з 1998 года, калі пачаліся рэгулярныя назіранні за касмічнымі аб'ектамі. Дарэчы, выяўлены ў лютым мінулага года ён быў выпадкова. Але пагрозы ён не ўяўляе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



Відавочцы:

## «Успышка... а потым зямля задрыжала»

**Мы патэлефанавалі ў Чалябінск. Таццяна Багатырова жыве ва ўласным доме ў раёне трактарнага завода. Вось што яна расказала пра падзеі таго часу:**

— Мы з унучкай Васілісай якраз у доме знаходзіліся. Недзе дзевяць гадзін было ці на пачатак дзясятай. Пачулі моцны гул. Глянулі ў акно — а там яркая ўспышка. Велізарная, я такой ніколі не бачыла.

Муж Анатоль быў на вуліцы, крычыць: «Ідзі сюды, глядзі!». Выбягаю. Чорныя клубы дыму ў небе сцелюцца, да зямлі цягнуцца. А муж і выбух бачыў. Я адразу падумала, што, мажа, самалёт ваенны разбіўся? Бо недалёка ад нас ваенны аэрадром, і якраз над нашым домам бамбардзіроўшчыкі Су-24 на пасадку заходзяць.

А потым зямля задрыжала. Як пасля землятрусу. Хвіліны дзве так доўжылася. Вельмі страшна было. Надта ўнучка спалохалася. А ў роце металічны прысмак з'явіўся. На першым паверсе ў нашым доме павыбівала вокны. На другім паверсе пазляталі вазоны з падаконніка.

Муж павёз унучку ў садзік. А там паўсюль выбітыя шыбы валяюцца. Зразумела, што параілі вяртацца дадому. І ў школе, чула, заняткі адмянілі, усіх дахаты адправілі. Вярталіся мае — дык па дарозе шмат дзе выбітыя шыбы бачылі. Асабліва каля гарадскога цырка.

Тэлефанавала дачцэ на працу. Тая кажа, што ў іх офісе шыбы цэлыя, але вокны парасчыняліся ад выбуху. І хто каля вокнаў сядзеў за камп'ютарамі — іх на падлогу паскідвала нават.

**Віктар ВІКЕНЦЬЕЎ**

■ Парламенцкі дзённік

# КАНКУРЫРАВАЦЬ НЕ АДЗІН З АДНЫМ, А РАЗАМ

**Беларускія і расійскія парламентарыі абяцаюць стварыць усе ўмовы хуткай рэалізацыі сумесных праектаў**

**Аб гэтым ішла размова на першым пасяджэнні міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве, якое адбылося ўчора ў Мінску.**

Яшчэ да пачатку пасяджэння Старшыня Савета Рэспублікі Анатоль РУБІНАЎ падчас сустрэчы з першым намеснікам Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расіі Аляксандрам ТОРШЫНЫМ прапанаваў правесці першы форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў кастрычніку гэтага года ў Магілёве.

— Магілёўская вобласць была прапанавана таму, што там вельмі інтэнсіўнае супрацоўніцтва, у тым ліку прымежнае, з расійскімі рэгіёнамі, — патлумачыў Анатоль Рубінаў.

Спікер верхняй палаты беларускага парламента адзначыў, што 2012 год быў вельмі плённым у плане развіцця інтэграцыйных працэсаў у Саюзнай дзяржаве. Беларусь наведала Старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Валянціна Мацвіенка. Было падпісана пагадненне паміж верхнімі палатамі двух парламентаў, якое адкрыла новую старонку міжпарламенцкага ўзаемадзеяння.

Пасяджэнне міжпарламенцкай камісіі па рэгіянальным супрацоўніцтве стала першым практычным крокам на гэтым шляху. Першы віцэ-спікер Савета Федэрацыі Аляксандр Торшын выказаў журналістам задаволенасць добрай арганізацыяй і насычаным, цікавым зместам гэтага сходу.

— Расія вельмі зацікаўленая ў развіцці двухбаковых адносін з Рэспублікай Беларусь па цэламу шэрагу пытанняў, — сказаў ён. — Гэта і сумесная вытворчасць тавараў і паслуг, і развіццё перадавых тэхналогій, і перадача перадавога вопыту Беларусі ў многіх галінах. Нам ёсць чаму павучыцца ў агракультуры, інжынернай культуры, у культуры зборкі, шэфмантажу, будаўніцтва Беларусі. Не кажучы ўжо пра якасныя беларускія тавары, мэблю, прадукты харчавання і цэлую лінейку іншай вельмі запатрабаванай у Расійскай Федэрацыі прадукцыі. Зараз, калі ўступленне ў СГА нараджае жорсткае канкурэнтнае асяроддзе, мы маглі б выкарыстаць яшчэ і кааперацыю. Разам канкурэнцыю вытрымаць лягчэй. Гэта — прапісная ісціна, якой варта трымацца, тым больш што прапрацаваны ўжо шэраг рашэнняў, якія дазваляюць нам удзвюх, Расіі і Беларусі, канкурыраваць на еўрапейскім рынку больш эфектыўна.

Для гэтага трэба ўдасканаленне нарматыўнай базы і большая інфармацыйная адкрытасць, лічыць Аляксандр Торшын. На першым пасяджэнні міжпарламенцкай камісіі абмяркоўвалася стварэнне ў кожнай з васьмі федэральных акруг Расіі інфармацыйных цэнтраў аб Беларусі, у якіх можна было б даведацца аб развіцці яе прамысловасці, рэсурсах і інш.

— Вельмі важна, каб да сумесных навуковых праектаў, у тым ліку да саюзных праграм, былі прыцягнутыя рэгіёны, — пракаментаваў вынікі пасяджэння міжпарламенцкай камісіі намеснік Старшыні Савета Рэспублікі і сустаршыня міжпарламенцкай камісіі Анатоль РУСЕЦКІ. — Асноўныя беларускія інстытуты, якія ўдзельнічаюць у саюзных праграмах, размешчаны ў сталіцы. Яшчэ ў большай ступені цэнтралізацыя навукі выяўляецца ў Расіі: Санкт-Пецярбург, Масква, Новасібірск. Але ёсць жа яшчэ і шэраг навуковых цэнтраў у рэгіёнах. У тым жа Ніжнім Ноўгарадзе, напрыклад, вельмі развіта навука, пацвярджэнне чаму будаўніцтва нашай атамнай электрастанцыі (Ніжагародскі НДІ імя Седакова прапанаваў сістэму кіравання энергаблокамі для Беларускай АЭС. — **«Звязда»**). Мы абмяркоўвалі ў тым ліку і правядзенне форумаў у Беларусі і Расіі. Плануем прыцягнуць да ўдзелу ў іх навуковую суполку абедзвюх краін, у тым ліку Акадэмію навук Расійскай Федэрацыі.

Задача парламентарыяў — нарматыўная база, падкрэсліў Анатоль Русецкі. Неабходна значна паскорыць прыняцце рашэнняў пры праходжанні праектаў тых жа саюзных праграм. «Каб затрачваць не больш за год на прыняцце рашэння, і два — на рэалізацыю. Мы павінны жыць у рытме больш хуткім, чым нашы канкурэнты, — сказаў ён. — Мы прасілі, каб у саюзным бюджэце быў асобны радок аб фінансаванні рэгіянальнага супрацоўніцтва. Думаю, што гэта будзе апраўдана».

— На першым пасяджэнні першачарговымі аказаліся задачы тэхнічнага характару — пытанні прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Аднак гуманітарнае і палітычнае супрацоўніцтва не менш важнае, бо Расія і Беларусь з'яўляюцца носьбітамі вопыту, якім можна было б абменьвацца, каб пазбягаць памылак і больш паспяхова ўдзельнічаць у палітычнай канкурэнцыі на міжнароднай арэне, — дадаў другі сустаршыня міжпарламенцкай камісіі Аляксандр Торшын. — Думаю, што нават рэформа МУС, якая адбылася ў Расіі, павінна была праходзіць з улікам беларускага вопыту. Калі Саюзная дзяржава будзе будавацца тымі ж тэмпамі, якія ёсць зараз, то мы зможам прыцягваць адзін аднаго да рашэнняў многіх пытанняў, якія здаюцца зараз фантастычнымі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■

# «ПРАЦЭС НАВУЧАННЯ Ў АЎТАШКОЛАХ ПАВІНЕН ЛЕПШ КАНТРАЛЯВАЦЦА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ПРА СПРАВУ ВАРЛАМАВА

У судовых слуханнях па справе мадэльера Аляксандра Варламава аб'яўлены перапынак з-за стану яго здароўя.

— Суд праявіў занепакоенасць здароўем Варламава, і на 15 лютага ў слуханнях аб'яўлены перапынак, — адзначыў Аляксей Стук. — Варламаў будзе праходзіць абследаванне МРТ. Працяг судовага працэсу па справе былога дырэктара прадпрыемства «Агенцтва моды Сашы Варламава» будзе залежаць ад вынікаў абследавання падсуднага.

Згодна з паведамленнем агенцтва «Інтэрфакс-Захад», адвакат мадэльера паведаміў, што «па ўнутраных прычынах — былі больш цяжкія хворыя — шпіталя МУС абследаванне перанесена на наступную пятніцу». Адвакат не выключае таго, што пасля абследавання будзе прасіць суд змяніць меру стрымання ў дачыненні да свайго падабароннага. Бо «пры яго захворванні (Варламаў перанёс аперацыі на пазваночніку, пасля чаго ён стаў інвалідам 2 групы) патрэбныя рэабілітуючыя працэдуры — рэфлексатэрапія, іголкаўколванне, масаж».

Як «Звязда» раней паведамляла, Варламаў абвінавачваецца па пяці артыкулах Крымінальнага кодэкса (махлярства ў асабліва буйным памеры, крадзеж у буйным памеры шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, прысваенне маёмасці, ухіленне ад выплаты падаткаў, злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі). Па звестках следства, агульны матэрыяльны ўрон, нанесены злачыннымі дзеяннямі, у тым ліку і бацькам, чые дзеці займаліся ў гэтым агенцтве, склаў больш за 1 млрд 200 млн рублёў.

## ПРА СПРАВУ ДЗЕМЧУКА

На асуджанага за падман мінскіх дольшчыкаў бізнэсмена Сяргея Дземчука заведзены яшчэ шэраг крымінальных спраў.

— Дзямчук — дастаткова заможны чалавек, які галоўным чынам займаўся будаўнічай сферай. У дачыненні да яго расследуецца яшчэ шэраг крымінальных спраў, — адзначыў Аляксей Стук. — У прыватнасці, эпізоды новых крымінальных спраў тычацца ўзвядзення будынка на вуліцы Інтэрнацыянальнай, 3 у цэнтры Мінска. Акрамя таго, Дзямчук падазраецца ў падбухторванні да дачы хабару. Следства па новых эпізодах вядзе КДБ, і яны злучаны ў адну вытворчасць.

Аляксей Стук нагадаў, што спачатку суд Першамайскага раёна па крымінальнай справе падманутых дольшчыкаў апраўдаў бізнэсмена. Аднак па пратэсце пракуратуры прысуд быў адменены. У выніку ў снежні мінулага года Дзямчук быў прызнаны вінаватым у тым, што ў перыяд з 6 снежня 2005 года па 18 лістапада 2010 года ён па папярэдняй змове з групай асоб шляхам злоўжывання даверам сабраў грошы з дольшчыкаў (Br19,9 млрд) быццам бы на будаўніцтва жылога комплексу ў квартале вуліц Філімонава, Парніковай, Макаёнка і праспекта Незалежнасці. Грошы былі выкарыстаны не па мэтавым прызначэнні, а для падтрымання фінансавага стану падкантрольных Дземчуку фірмаў. У выніку жыллё не было пабудавана. За махлярства ў буйным памеры, здзейсненае падчас долевага будаўніцтва, бізнэсмен асуджаны на 8 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

## ПРА СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ

Паводле слоў намесніка Генпракурора, прымяненне смяротнага пакарання ў Беларусі пакуль адмяняць не збіраюцца. «Яно (смяротнае пакаранне) у нас захоўваецца, і інфармацыяй аб нейкіх відавочных перадумовах да змянення гэтага становішча Генпракуратура не валодае». Пры гэтым ён адзначыў, што летась у Беларусі не было вынесена ніводнага смяротнага прысуду.

**Надзея ДРЫЛА.**

■ Пытальнік

## НОВЫЯ ПАМЕРЫ ПАДАТКОВЫХ ВЫЛІКАЎ

**Ужо пасля правядзення нашым выданнем «прамой лініі» наконт дэкларавання даходаў у рэдакцыю патэлефанавала наша чытачка Алена Касцюковіч. Алену Мікалаеўну цікавілі памеры стандартных падатковых вылікаў ужо ў гэтым годзе.**

Падрабязную інфармацыю па гэтым пытанні нам прадаставіла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Святлана ШАЎЧЭНКА**.

У 2013 годзе для падаткаплацельшчыкаў з даходам не больш як 3 млн 350 тысяч рублёў за месяц стандартны падатковы вылік складае 550 тысяч рублёў (у 2012 годзе мяжа заробкаў была на ўзроўні 2 млн 680 тысяч рублёў, а вылік — 440 тысяч рублёў). Для асобных катэгорый грамадзян (інваліды I і II групы, удзельнікі вайны, асобы, што пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, і іншыя) стандартны вылік з 1 студзеня 2013 года вызначаны ў памеры 780 тысяч рублёў. Летась такі падатковы вылік складаў 623 тысячы рублёў.

**Сёлета праіндэксаваны (павялічаны) межы асобных відаў даходаў, якія не абкладаюцца падаходным падаткам.** Такім чынам, з 1 студзеня вызваляюцца ад падаходнага падатку даходы, атрыманыя ад фізічных асоб, што не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, у выглядзе дарэння пры ўмове, калі такія даходы ў агульнай суме не перавышаюць 33 млн 100 тысяч рублёў (у 2012 годзе было 26 млн 500 тысяч рублёў). Сёлета павялічаны памер неабкладных падаткам даходаў, якія не з'яўляюцца ўзнагародай за выконванне працоўных абавязкаў. Напрыклад, гэта матэрыяльная дапамога, падарункі, прызы, аплата кошту пуцёвак, атрыманых ад арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў па месцы асноўнай працы (службы, вучобы) на суму ад 10 млн рублёў за год (летась было 8 млн рублёў). Для далейшага развіцця добраахвотнага страхавання дадатковых пенсій, а таксама страхавання медыцынскіх расходаў памер падатковай ільготы для даходу, што атрымлівае фізічная асоба ў выглядзе аплаты за яго страхавых паслуг арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, павялічаны. Гэтая льгота прадугледжвае вызваленне ад падаткаабкладання даходаў у выглядзе аплаты страхавых паслуг у памеры да 6 млн рублёў ад кожнай крыніцы на працягу падатковага перыяду.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

■ Футбол. Ліга Еўропы

## НУЛІ ДЛЯ РАЗВАЖАННЯЎ

**У першым матчы 1/16 розыгрышу Лігі Еўропы барысаўскі БАТЭ не даў забіць турэцкаму «Фенербахчэ», але і сам не адзначыўся трапным ударам. 0:0 — лік, які пакуль нічога не вырашае ў беларуска-турэцкім супрацьстаянні.**


Фота Надзеі БУЖАН.

Турэцкі «Фенербахчэ» — адзін з лідараў тамтэйшага футбола. Клуб 18 разоў станавіўся чэмпіёнам краіны і цяпер вядзе актыўную барацьбу за залатыя ўзнагароды з «Галатасараем» і «Бешыкташам». Каманда літаральна нашпігавана сусветнымі зоркамі. Галандзец Дзірк Кюйт, партугалец Рауль Мейрэлеш, камерунец Муса Соў, бразілец Крыстыян Бароні — футбалісты, якія з'яўляюцца аплотам калектыву. Толькі часам здараецца так, што нечакана і лідары падводзяць. На пачатку гульні Мейрэлеш літаральна скасіў Аляксандра Глеба. Удар быў больш падобны на прыём з вулічнай бойкі, чым на спартыўную барацьбу. Татуіраваны футбаліст адразу ўбачыў перад сабой чырвоную картку, а пасля яшчэ доўга высвятляў, за што яго так пакаралі і выдалілі. Здалося: вось ёсць шанц на вікторыю, падарунак Фартуны, але беларусы не здолелі скарыстацца перавагай у аднаго футбаліста. А гэта ўжо зноў падводзіць да размовы аб тым, што на еўрапейскай арэне мы звykліся гуляць другім нумарам, разлічваючы на контрвыпады. «Канаркі» закрыліся ў абароне, а беларусы так і не падабралі да яе адпаведны ключык. Усё проста. Чакаем гульні ў адказ.

— Расчараванне ёсць, — прызнаўся пасля паядынку Віктар Ганчарэнка, галоўны трэнер БАТЭ. — Асноўная прычына таго, што ў нас не атрымалася забіць, у тым, што нам не хапала хуткай работы з мячом пры арганізацыі атак. З іншага боку — мы здолелі захаваць свае вароты ў недатыкальнасці. Гэты фактар таксама трэба ўлічваць як істотны.

**Тарас ШЧЫРЫ**

■

# МАРА ГЕНЕРАЛЬНАГА

**У Беларусі жыве чалавек, якім можа ганарыцца кожны яе жыхар. Вучоны, канструктар, стваральнік беларускай школы канструявання і даследавання грузавых аўтамабіляў, Герой Беларусі — Міхаіл Высоцкі. Днямі ён адзначыў сваё 85-годдзе. Яго асабіста павіншаваў кіраўнік нашай дзяржавы, а навуковая супольнасць наладзіла ў яго гонар урачыстае свята. На жаль, сам акадэмік прысутнічаць на свяце не змог: не дазволіла здароўе. Але ўсе мы спадзяёмся, што гэты чалавек абавязкова дачакаецца, калі галоўная машына яго жыцця адправіцца ў свой першы маршрут.**



Гэта яму мы абавязаны сваімі знакамітымі грузавікамі і аўтобусамі. А пачалося ўсё з дзіцячых уражанняў. Сам Міхаіл Высоцкі згадвае: «Нарадзіўся я на Капыльшчыне — у вёсцы Семежава побач з Кацярынінскім трактам, па якім яшчэ да вайны на Маскву ішлі легкавыя аўтамабілі. Там, дзе мы ў дзяцінстве любілі купацца, досыць часта спыняліся машыны. І мы заўсёды з задавальненнем дапамагалі кіроўцам па драбязе, за што яны дазвалялі нам пасядзець за рулём. Гэта паўплывала на маю любоў да тэхнікі».

Любоў гэтая дапамагла прыняць рашэнне аб паступленні ў аўтамеханічны тэхнікум у Мінску. Міхаіл Сцяпанавіч вучыўся і працаваў слесарам на Мінскім аўтамабільным заводзе, збіраў першыя беларускія самазвалы, а потым стаў працаваць на тым жа заводзе канструктарам. У 33 гады ён ужо быў галоўным канструктарам МАЗа. Яго працоўны стаж налічвае шэсць дзесяцігоддзяў, з якіх сорак гадоў — у якасці галоўнага канструктара ўсіх аўтамабільных заводаў краіны. Цэлае жыццё, багатае на падзеі, дасягненні, любоў, выпрабаванні і незабыўныя сустрэчы.

Ён асабіста ведаў Сяргея Каралёва: з МАЗаўскіх прычэпаў запускалі ракеты і касмічныя спадарожнікі. Для яго ладзіў парад сваіх аўтамабіляў Генры Форд. Яму ўдавалася пераконваць у сваёй праваце кіраўніка ўрада СССР Аляксея Касыгіна. Яму даверыў адраджэнне беларускага машынабудавання Аляксандр Лукашэнка...

Сваю сустрэчу з Прэзідэнтам Беларусі ў 1995 годзе Міхаіл Высоцкі лічыць лёсавызначальнай для беларускай аўтамабільнай прамысловасці. «Я ўжо тры гады працаваў у Акадэміі навук віцэ-прэзідэнтам і адначасова з'яўляўся галоўным канструктарам «БелаўтаМАЗа», — ўзгадваў ён. — Справы былі няважныя, трэба было нешта тэрмінова рабіць, ставіць галіну на ногі. Мы паказалі кіраўніку дзяржавы выстаўку канкрэтных навуковых распрацовак. Прэзідэнт спытаў, як іх укараніць, і на наш адказ пра патрэбу ў грошах паабяцаў дапамогу. У выніку была распрацавана дзяржаўная навукова-тэхнічная праграма «Белаўтатрактарабудаванне», потым — іншыя мэтавыя праграмы, якія літаральна выратавалі наша машынабудаванне.»

Міхаілу Высоцкаму належыць вялікая заслуга ва ўмацаванні сувязі навукі з вытворчасцю. Яшчэ ў 1970-х ён стварыў пры Акадэміі навук аддзел грузавых аўтамабіляў двайнога падпарадкавання — акадэміі і заводу, навукова-вытворчае аб'яднанне «МАЗ-БПІ» з кафедрай «Велікагрузныя аўтамабілі», якую сам узначаліў, навукова-вытворчае аб'яднанне «Аўтафізтэх», а пазней — штатныя лабараторыі пры акадэміі, таксама двайнога падпарадкавання.

З яго іменем звязаны найбольш значныя дасягненні Мінскага аўтазавода: распрацоўка прынцыпова новай кампаноўкі велікагрузных аўтамабіляў «кабіна над рухавіком», якая атрымала распаўсюджванне па ўсім свеце, стварэнне канцэптуальнага модульнага аўтацягніка «МАЗ-200 «Перабудова», які быў прызнаны аўтамабілем XXI стагоддзя і атрымаў залаты медаль на Парыжскім Вялікім салоне аўтамабілебудавання ў 1988 годзе, стварэнне шасці пакаленняў магістральных аўтацягнікоў. Па яго ініцыятыве і пад яго кіраўніцтвам на МАЗе была арганізавана вытворчасць першых беларускіх аўтобусаў.

У 1990-х на пасадзе віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук ён кансалідаваў намаганні вучоных і канструктараў не толькі ў інтарэсах Мінскага аўтазавода, але і ўсёй аўтатрактарабудаўнічай галіны краіны, што дазволіла забяспечыць станаўленне нацыянальнага аўтамабіле- і аўтобусабудавання.

**Ён асабіста ведаў Сяргея Каралёва: з МАЗаўскіх прычэпаў запускалі ракеты і касмічныя спадарожнікі. Для яго ладзіў парад сваіх аўтамабіляў Генры Форд.**

З 2002 года Міхаіл Высоцкі з'яўляецца генеральным канструктарам па аўтамабільнай тэхніцы Рэспублікі Беларусь. Акадэмік, аўтар 145 вынаходніцтваў і патэнтаў, 450 навуковых прац, у тым ліку 20 манаграфій, намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце ў галіне аўтамабільнай і кар'ернай тэхнікі Аб'яднанага інстытута машынабудавання НАН Беларусі, ён ні на хвіліну не спыняе сваю творчую думку, ні на ёту не адхіляецца ад сваёй канструктарскай мары. Ён кажа, што галоўны аўтамабіль яго жыцця пакуль яшчэ не адправіўся ў свой першы маршрут — ад Брэста да Уладзівастока, Кітая і назад.

Размова пра шматзвённы магістральны аўтацягнік — сучасную версію яго знакамітага МАЗа-2000. Гэты аўтамабіль замяняе тры вялікія фуры. Пры гэтым кіраваць ім можа адзін чалавек і паліва патрэбна на 30-40% менш. Міхаіл Высоцкі ўпэўнены, што аўтамабіль прынясе вялікую карысць Беларусі.

Ну а мы проста абавязаны ведаць імя гэтага чалавека. Каб з гонарам назваць яго сваім дзецям. Бо дзякуючы такім, як ён, нам ёсць чым ганарыцца. «Звязда» віншуе Маэстра беларускага аўтамабілебудавання, жадае яму здароўя і ажыццяўлення мары.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**



# ІНТЭГРАЦЫЯ ПРАЗ КАРПАРАЦЫІ

**Беларусь і Расія рыхтуюцца да распрацоўкі і рэалізацыі шэрагу буйных сумесных праектаў, якія стануць першым крокам да стварэння беларуска-расійскіх транснацыянальных карпарацый (ТНК).**

Пра гэты намер было заяўлена на нядаўна праведзенай сустрэчы прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Міхаіла Мясніковіча з дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі Рыгорам Рапотам. Абмеркаванню пытання стварэння сумесных беларуска-расійскіх ТНК быў прысвечаны візіт і віцэ-прэм'ера ўрада Расійскай Федэрацыі Аркадзя Дварковіча, які адбыўся 12 лютага.

Вядома, што такія прадпрыемствы, як МАЗ, Мінскі завод колавых цягачоў, МТЗ, «Беларуськалій», «Нафтан», «Гродна Азот», Мазырскі НПЗ, прадпрыемствы ваенна-прамысловага комплексу (ВПК) і інш. даўно цікавяць расійскі бок. Але найбольш прымальнай формай еўразійскай інтэграцыі для Беларусі з'яўляецца не «інтэграцыя праз прыватызацыю», а «інтэграцыя праз стварэнне ТНК».

Калі зыходзіць з таго, што Адзіная эканамічная прастора і будучы Еўразійскі эканамічны саюз (ЕАЭС) будуць мець поспех толькі ў выпадку накіраванасці на стварэнне новага грамадскага багацця, а не на перадзел старога, тады галоўным арыенцірам эканамічнай палітыкі Беларусі, Расіі і Казахстана павінна стаць менавіта стварэнне еўразійскіх ТНК. Фармат інтэграцыі праз стварэнне ТНК дазволіць, з аднаго боку, пазбегнуць няплённай канкурэнцыі паміж сабой у межах АЭП, а з другога — павысіць канкурэнтаздольнасць на знешнім глабальным рынку.

Зусім нядаўна Цэнтр інтэграцыйных даследаванняў Еўразійскага банка развіцця (ЦІД ЕАБР) выдаў аналітычны даклад пад назвай «Тэхналагічная кааперацыя і павышэнне канкурэнтаздольнасці ў АЭП», які таксама прысвечаны пытанню стварэння еўразійскіх ТНК. У ім разглядаецца стан тэхналагічнай кааперацыі і карпаратыўнай інтэграцыі на тэрыторыі АЭП і фармулююцца прапановы па іх паглыбленні. Акрамя таго, дадзены прапановы па распрацоўцы агульнай гандлёва-прамысловай палітыкі, накіраванай на павышэнне навукаёмістасці прамысловай вытворчасці краін — удзельніц інтэграцыйнага аб'яднання, фарсіраванае ўваходжанне эканомікі АЭП у новы (шосты) тэхналагічны ўклад і павышэнне яе сукупнай канкурэнтаздольнасці.

**На сённяшні дзень у Расіі і Беларусі ў галіне прамысловасці самым вялікім патэнцыялам высокатэхналагічнага развіцця валодае ВПК. Магчыма, дзеля паскарэння тэхналагічнага і інавацыйнага развіцця ў межах АЭП трэба стварыць еўразійскі аналаг Агенцтва перспектыўных абаронных і навукова-тэхнічных праектаў (DARPA), як у ЗША.**

Але гэтая задача не простая, яна патрабуе ўдасканалення інстытутаў, праз якія ажыццяўляецца дзяржаўнае (і наддзяржаўнае — для АЭП) заахвочванне тэхналагічнай і навуковай кааперацыі, карпаратыўнай інтэграцыі, стымуляванне інавацыйнай дзейнасці эканамічных суб'ектаў, а таксама выкарыстанне адпаведных інструментаў бюджэтна-падатковай і грашова-крэдытнай палітыкі, стварэнне перспектыўных стратэгічных канцэпцый, распрацоўка і рэалізацыя палітыкі асваення эканомікамі краін Мытнага саюза вытворчасці, заснаванай на пятым і шостым тэхналагічных укладах.

Сёння аб'ектыўныя ўмовы эканамічнага развіцця АЭП патрабуюць павышэння ролі прамысловага комплексу ў гаспадарчых сістэмах краін — членаў інтэграцыйнага аб'яднання. Асаблівасць АЭП у цэлым заключаецца ў тым, што прамысловы і кадравы канкурэнтны патэнцыял тут існуе. Страчаныя з савецкіх часоў звёны патрабуюць аднаўлення, што больш рэальна, чым стварэнне за кароткі час гэтага патэнцыялу наноў. Але для рэалізацыі гэтай задачы патрабуецца глабальная канкурэнтная макрастратэгія АЭП на ўзроўні тэхналогій і кааперацыі, а таксама ўзгодненай карты высокіх і навукаёмістых тэхналогій, якія падлягаюць засваенню і развіццю ў Адзінай эканамічнай прасторы. Важнейшымі элементамі прамысловай палітыкі АЭП павінны стаць спецыялізацыя, кааперацыя, карпаратыўная інтэграцыя і праектны падыход.

Пры гэтым гаворка павінна ісці не толькі пра ўзгодненую прамысловую палітыку краін — удзельніц АЭП, але і пра агульную гандлёва-прамысловую палітыку. Для гэтага трэба стварыць адзіны орган АЭП у галіне планавання прамысловага развіцця, размяшчэння вытворчых сіл, рэгулявання цэн і цэнаўтварэння, галіновых асацыяцый і саюзаў АЭП, якія прадстаўляюць узгодненыя інтарэсы вытворцаў, міждзяржаўныя кампаніі на аснове дзяржпакетаў акцый, выпрацаваць працэдуры фарміравання і рэалізацыі адзінай гандлёва-прамысловай палітыкі і экспартнай стратэгіі ў рамках АЭП.

На сённяшні дзень, паводле даследавання «Маніторынг узаемных інвестыцый у краінах СНД», якое праводзілася ў 2012 годзе ЦІД ЕАБР і Інстытутам міжнароднай эканомікі і міжнародных адносін Расійскай акадэміі навук, стан карпаратыўнай інтэграцыі ў АЭП мае нізкія паказчыкі. Яны сведчаць аб нязначнай карпаратыўнай інтэграцыі Расіі з Казахстанам і Беларуссю ў галіне апрацоўчай прамысловасці і машынабудавання. Супрацоўніцтва сканцэнтравана ў асноўным у галіне нетраспажывання і нафтахіміі, якія не патрабуюць развіцця новых прарыўных тэхналогій.

**Найбольш прымальнай формай еўразійскай інтэграцыі для Беларусі з'яўляецца не «інтэграцыя праз прыватызацыю», а «інтэграцыя праз стварэнне ТНК».**

Між тым, асаблівы інтарэс з пункту гледжання рэальнай інтэграцыі ўяўляе кааперацыя і інтэграцыя дзяржкампаній або кампаній з дамінуючай доляй дзяржавы, бо канкурэнцыя паміж імі ў АЭП далёка не заўсёды апраўдана, як, напрыклад, у выпадку канкурэнцыі МАЗа з КамАЗам (бо цягне дадатковыя выдаткі і не дазваляе рэалізаваць эфект маштабу). Патрабуецца выпрацоўка такога падыходу, пры якім канкурэнцыя ўнутры АЭП заахвочваецца толькі там, дзе яна сапраўды мэтазгодная.

Рэалізацыя планаў стварэння аб'яднанай кампаніі «Расбелаўта» на аснове інтэграцыі МАЗа і КамАЗа магла б паслужыць першым прыкладам сур'ёзнай прамысловай інтэграцыі на тэрыторыі АЭП. Лёс і поспех еўразійскіх інтэграцыйных працэсаў будзе залежаць ад здольнасці бакоў дамовіцца аб такім фармаце аб'яднання. У іншым выпадку (напрыклад, прымусу да прыватызацыі) стане зразумела, што пад шыльдай еўразійскай інтэграцыі расійскі капітал вырашае свае задачы па ўмацненні сваіх бізнэс-імперый.

Акрамя агульнай гандлёва-прамысловай палітыкі, неабходнай умовай з'яўляецца таксама фарміраванне адзінай навукова-тэхналагічнай палітыкі АЭП, арыентаванай на паскоранае станаўленне (даганяючае развіццё) вытворчасцяў пятага тэхналагічнага ўкладу, у аб'ёме, дастатковым для фарсіраванага ўваходжання (прарыўныя тэхналогіі) у шосты тэхналагічны ўклад. Дзеля гэтага трэба стварыць міждзяржаўную арганізацыю (ці трансфармаваць Цэнтр высокіх тэхналогій ЕўрАзЭС) — Еўразійскае агенцтва высокіх і навукаёмістых тэхналогій. Такая арганізацыя павінна стаць свайго роду тэхналагічным банкам АЭП, мець самастойны бюджэт, узаемадзейнічаць з венчурным капіталам, адбіраць прыярытэтныя і сістэмна неабходныя высокатэхналагічныя праекты, фінансуючы іх на першым этапе.

На сённяшні дзень у Расіі і Беларусі ў галіне прамысловасці самым вялікім патэнцыялам высокатэхналагічнага развіцця валодае ВПК. Магчыма, дзеля паскарэння тэхналагічнага і інавацыйнага развіцця ў межах АЭП трэба стварыць еўразійскі аналаг Агенцтва перспектыўных абаронных і навукова-тэхнічных праектаў (DARPA), як у ЗША.

Гісторыя стварэння Еўрапейскага саюза пачыналася з утварэння ў 1950 годзе Еўрапейскага аб'яднання вугалю і сталі, гэта значыць, тых галін прамысловасці, якія былі звязаны з ВПК. Па аналогіі, магчыма, і стварэнне ЕАЭС трэба пачынаць якраз з аб'яднання ВПК Беларусі, Расіі і Казахстана?! Але ўсё роўна гаворка ідзе пра «інтэграцыю праз стварэнне ТНК», а не прыватызацыю...

**Арсеній СІВІЦКІ, палітычны аглядальнік «Звязды».**

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі трэцяга склікання па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Анатолю Аляксандравічу Малафееву ў сувязі з вялікім горам, што напаткала яго, — смерцю СЯСТРЫ.**


## ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»

**г. Минск, ул. Богдановича, 129**

**сообщает, что 22 марта 2013 года в 11.00 в конференц-зале акционерного общества по адресу: 220123, г. Минск, ул. Богдановича, 129 состоится очередное общее собрание акционеров с повесткой дня:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2012 год. Об основных направлениях хозяйственной деятельности Общества на 2013 год. Отчет генерального директора Общества.
2. О рассмотрении Заключения ревизионной комиссии по результатам проведения ежегодной ревизии деятельности Общества за 2012 год.
3. О рассмотрении Аудиторского заключения, подготовленного по результатам проведения ежегодного аудита Общества.
4. Утверждение годового отчета Общества за 2012 год, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества по итогам финансово-хозяйственной деятельности за 2012 год.
5. Утверждение направлений использования чистой прибыли в 2013 году. О порядке и сроках выплаты дивидендов по итогам финансово-хозяйственной деятельности за 2012 год.
6. Утверждение отдельных решений, принятых Советом директоров.
7. Избрание членов Совета директоров Общества.
8. Избрание членов ревизионной комиссии Общества.
9. О вознаграждении членов Совета директоров и ревизионной комиссии.
10. Об отчуждении предприятия как имущественного комплекса, право собственности по которому принадлежит ОАО «Белтрубопроводстрой», зарегистрированному в ГУП «Национальное кадастровое агентство» за № 0000014.

Собрание проводится в очной форме. Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, 20 февраля 2013 года. С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Богдановича, 129 в рабочие дни с 15 по 21 марта 2013 г.

**Регистрация участников собрания с 9.00 до 10.45 по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт; представителю акционера – паспорт и доверенность.**

**Сведения по телефонам: 334 30 31, 334 33 83.**

*УНП 100364117* **Совет директоров.**

**Утерянный представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланк страхового полиса** по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0156726 **считать недействительным.** УНП 101883943


Сардэчна віншуем **Мікалая Мікалаевіча МАРКЕВІЧА** з г. Навагрудка **з юбілеем**. Шчасця, здароўя на доўгія гады.



*Добрых слов накопилось немало,*
*Чтоб сказать их сегодня тебе,*
*Чтоб светлее и радостней стало*
*У тебя на душе и в семье.*
*Пусть в глазах твоих добрых, лучистых*
*Будет вечно гореть яркий свет.*
*Ты для нас самый добрый на свете.*
*Самый близкий, родной человек.*

**З павагай і любоўю, бабуля Каця, дзядуля Ваня.**

# ПЕРАВАГІ «ЗАЛАТОГА» ЎЗРОСТУ

## дапамагаюць адчуць у Кобрынскім цэнтры сацыяльнага абслугоўвання

**Не скажаш, што тыповая, але і не рэдкая гісторыя кабрынчанкі-пенсіянеркі: удавой засталася ў 34 гады. Адна выхоўвала дачку, са скуры лезла, каб у дзяўчынкі ўсё было, як у людзей, каб атрымала яна добрую адукацыю. Выгадавала, вывучыла, увесь час змагаючыся з безграшоўем, адмаўляючы сабе часам у самым неабходным. Дачушка вырасла добрая, але ў яе свой сямейны лёс. Муж паехаў працаваць у Іран, а яна — за ім. З матуляй трымаюць сувязь па скайпе. Маці, вядома, радуецца поспехам дзяцей і ўнукаў, ні на што не скардзіцца. Але чулая дачка ўсё роўна здагадвалася, як загрызае матулю адзінота. Так было яшчэ два гады таму...**



Вера ЛАЎРОВА.

А нядаўна дзеці ёй пазванілі ўвечары — яна толькі парог пераступіла. І адразу давай з імі ўражаннямі дзяліцца: «Вой, я так натанцавалася!» Дачка на сёмым небе была, прасіла перадаць падзяку тым, хто арганізаваў гэты цудоўны клуб для пажылых людзей. Сказала, што вельмі рада за маці, што ёй цяпер нашмат спакайней.

Другая гараджанка сама прыходзіла дзякаваць за тое, што аднаклубнікі літаральна выцягнулі з дэпрэсіі яе цётку, якая нядаўна пахавала мужа. «Наша суполка — не проста клуб па інтарэсах для пенсіянераў, — разважае Вера Лаўрова. — Гэта магчымасць адчуваць сваю годнасць, запатрабаванасць, сваю значнасць, нарэшце. Мы патрэбны найперш адно аднаму. Знайшлі магчымасць жыць цікава, насычана. Мы збіраемся разам, ходзім у госці адна да адной, наведваем таго, хто захварэў, выбіраемся на канцэрты і дыскатэкі, займаемся самаадукацыяй. Бывае, часу на ўсё не хапае».

### Гісторыі жыцця, гісторыі кахання

Вера Васільеўна, стыльна апранутая цікавая жанчына, відавочна, адна з лідараў клуба «Залаты ўзрост», які дзейнічае пры тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Яна тут вядзе гурток рукадзелля. Раней за сабой такіх талентаў асабліва не заўважала. А як пайшла на пенсію, пачала нешта шыць, ствараць мяккія цацкі, карціны з тканіны. Цяпер разам з сяброўкамі шыюць сімпатычных дамавікоў, лялькі-абярэгі, з бутэлек робяць арыгінальныя вазы, ствараюць карціны з абрэзкаў тканіны.

Вера Васільеўна паказвае свае вырабы і перыядычна адказвае на званкі. Аказалася, спатрэбілася ўдакладніць некаторыя акалічнасці святкавання Дня святога Валянціна.

**У нас магчымасць адчуваць сваю годнасць, запатрабаванасць, сваю значнасць, нарэшце. Мы патрэбны найперш адно аднаму.**

— Вырашылі купіць торт, пасядзець з чаем, — смяецца Вера Васільеўна. Здзіўляецеся, што ўдзельніцы конкурсу «Супербабуля» адзначаюць такое «дзіцяча-юнацкае» свята? Для нас гэта нагода лішні раз сабрацца. У многіх нашых удзельнікаў клуба такія гісторыі жыцця і гісторыі кахання — раман напісаць можна! Так што падзяліцца ёсць чым. Некаторыя, праўда, і пісаць сталі. Вось, напрыклад, Валянціна Літошык пасля выхаду на пенсію пачала пісаць вершы. І добрыя вершы, яе нават друкуюць у перыёдыцы. Святлана Грыцук адкрыла ў сабе публіцыстычныя здольнасці. Яна цяпер выпускае наш клубны бюлетэнь.

### Адукацыя заўсёды

— Клуб пажылых людзей пад эгідай цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва з'явіўся ў Кобрыне ў 2010 годзе. Яго мэта — адукацыя грамадзян паважанага ўзросту з тым, каб палепшыць іх жыццё, — гаворыць Таццяна Байко, дырэктар цэнтра.

Першай адукацыйнай праграмай сталі камп'ютарныя курсы. 12 чалавек займаліся ў каледжы лёгкай прамысловасці, асвойвалі азы камп'ютарнага пісьма і інтэрнэту. Тыя першыя слухачы сёння ўжо маюць персанальныя ЭВМ і паспяхова карыстаюцца імі. А курсы сталі настолькі папулярнымі, што цяпер іх праводзяць нават на платнай аснове, і ахвотныя запісваюцца ў чаргу.

Вельмі папулярнымі сталі заняткі па тэмах «Як будаваць свае адносіны з дарослымі дзецьмі», «Як стаць сапраўдным сябрам для ўнука ці ўнучкі», «Мастацтва старэць», «Аэробіка для розуму», заняткі са спецыялістамі па здаровым ладзе жыцця, курс гутарак са святаром па асновах праваслаўнай культуры і многія іншыя.

Дзе браць грошы на ўсё гэта? Большая іх частка выдзяляецца з бюджэту. Ды і самім трэба «круціцца», лічыць Таццяна Байко. Летась Кобрынскі цэнтр прымаў удзел у конкурсе праектаў па развіцці адукацыйных праграм для дарослых, які праводзіўся Акадэміяй кіравання сумесна з нямецкім фондам. Не толькі паўдзельнічалі, але і выйгралі. Атрымалі гранд на суму больш за 10 тысяч еўра. А значыць адукацыйныя праграмы працягнуцца.

Увогуле ж 120 сацыяльных работнікаў цэнтра штодня дапамагаюць пажылым людзям у іх паўсядзённым жыцці. «За гэты час, — разважае Таццяна Байко, — я навучылася ў іх мудрасці, розуму, цярпліваму стаўленню да жыцця». Расказала, як у першыя гады сваёй працы ездзіла па вёсках да тых, каго бралі на абслугоўванне. І заўсёды мучылася пытаннем: чаму гэтыя людзі вось так дажываюць свой век: бездапаможнымі, адзінокімі, часта — забытымі ўласнымі дзецьмі? Потым пачала спасцігаць, што гэта рэальнасць, якую ў адзін момант не пераменіш. Трэба ўспрымаць яе як ёсць і, па магчымасці, уплываць на сітуацыю.

### Пенсія — гэта не страшна

Клуб «Залаты ўзрост» — яе любімае дзецішча. «Раней я неяк пабойвалася пенсійнай перспектывы, — разважае Таццяна Байко. — А цяпер чакаю будучы выхад на заслужаны адпачынак з аптымізмам і надзеяй. Бо гляджу на нашых актыўных, пазітыўных, усебакова развітых пенсіянераў і радуюся. Аказваецца, можна цікава арганізаваць сваё жыццё, шмат чытаць, ажыццявіць тое, што не паспеў у маладосці з-за працы і сямейных клопатаў. Усё залежыць ад чалавека. Напрыклад, Марыя Васільеўна, 75-гадовая пенсіянерка, вырошчвае на падворку кветкі. А на выручаныя грошы штогод ездзіць адпачываць на мора.

**Объект долевого строительства** – 6-подъездный, 14-16-этажный, 308-квартирный жилой дом со встроенными на первых этажах помещениями административного и общественного назначения общей площадью 2985,1 кв.м, техническим подпольем и «теплым» техническим чердаком, пассажирскими и грузопассажирскими лифтами. Высота жилых помещений (пол-потолок) – 2,7 м, административных – 3,0 м.

Конструкция здания – монолитный железобетонный каркас с плоскими монолитными перекрытиями с сеткой колонн, наружные стены из блоков ячеистого бетона, окна из ПВХ профиля с двухкамерными стеклопакетами. Наружная и внутренняя отделка решена на основе применения современных отделочных материалов и конструкций.

**Благоустройство участка** включает подъезд к дому, автомобильную стоянку на 77 машино-мест, плиточное покрытие пешеходных связей, детские площадки общей площадью 153 кв.м и площадки для отдыха взрослого населения 40 кв.м, озеленение территории с установкой малых архитектурных форм.

**Жилые помещения:** все квартиры располагаются на 3-14 (16) этажах. Общая площадь жилой части дома составляет 18 557 кв.м. Всего 308 квартир.

Для привлечения физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей к строительству по договорам создания объекта долевого строительства в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 15.06.2006 № 396 предлагается 65 (Шестьдесят пять) квартир, со стоимостью за 1 кв.м 12 000 000 (Двенадцать миллионов) белорусских рублей, из них:

- однокомнатные – 19 квартир, максимальной площадью 41,55 $м^2$;
- двухкомнатные – 10 квартир, максимальной площадью 63,94 $м^2$;
- трехкомнатные – 27 квартир, максимальной площадью 81,09 $м^2$;
- четырехкомнатные – 9 квартир, максимальной площадью 123,84 $м^2$.

В зависимости от типа квартир, размера первоначального и сроков внесения последующих платежей **применяется гибкая система скидок**.

Строительная готовность жилых помещений:
штукатурка стен (без окраски стен и потолков);
бетонная подготовка под полы (без покрытия);
двери: входные – деревянные, внутренние – не устанавливаются;
- монтаж электропроводки согласно проектной документации с установкой счетчиков учета эл. энергии;
- горячее и холодное водоснабжение – стояки с приборами учета;
- канализация – монтаж канализационных стояков с подключением одного унитаза;
- монтаж системы отопления с установкой радиаторов;
- вентиляция – вытяжная естественная;
- телефонизация, радиофикация, телевидение – согласно проекта.

Строительная готовность помещений общего пользования (тамбур, вестибюль, лифтовые холлы, лестничные клетки, коридоры и др.) – стопроцентная чистовая отделка.

**Общее имущество, которое будет находиться в общей долевой собственности:** межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, чердаки, другие места общего назначения, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Строительство производится при наличии у застройщика следующих документов:

- заключение Комитета архитектуры и градостроительства Мингорисполкома от 27.05.2011 № 05-27/108Ф;
- проектная документация, прошедшая государственную экспертизу (экспертное заключение от 20.01.2010 № 2157-5/09 с дополнениями от 28.04.2010 № 240-15/10, от 11.11.2011 № 905-15/11, от 29.12.2011 № 1170-15/11);
- решение Минского горисполкома от 27.01.2011 № 233 о переходе права пользования и разрешении на строительство с изменениями, внесенными решением Минского горисполкома от 12.07.2012 № 2213;
- свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации земельного участка от 25.07.2012 № 500/1109-3567 с изменениями, внесенными согласно извещению от 29.12.2012 № 500/1312-844;
- договора строительного подряда с ООО «КвадроМонтажСтрой» № ГП-22/01-13 от 22.01.2013.
- разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-208Ж-063/10, выданное инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску.

Предложение, указанное в настоящей Проектной декларации, действует до момента выхода новой Проектной декларации и отменяет опубликованные ранее.

Информацию по объекту долевого строительства и условиям заключения договоров можно получить в риэлтерской компании ОДО «Твоя столицаконсалт» по адресу: г. Минск, ул. Шафарнянская, д. 11, тел. 286 38 38; моб. тел. (029) 680 01 01.

**Директор** **Д.Н. Миневич**

Наш культурны асяродак
# Жырандоля
Выпуск № 7 (177)

■ Выстава

# КАРАЛІ І ФАРФОР

## Калекцыю польскай керамікі XVIII—XX стагоддзяў можна пабачыць у Мінску

**Яе прывезлі з Верхнесілезскага музея польскага горада Бытам, дзе захоўваюцца ўнікальныя экспанаты, якія могуць прыадкрыць таямніцы таго, як цудоўныя рэчы навучыліся вырабляць у Еўропе.**

Польскаму каралю Аўгусту II Моцнаму вельмі падабаўся фарфор. Вытанчаныя вырабы краналі сваёй крохкасцю, але ж мо з-за гэтага здаваліся сапраўды вартымі каралеўскіх асоб. Нездарма ж еўрапейцы так «запалі» на вырабы з фарфору, якія траплялі да іх у рукі падчас крыжовых паходаў. Але хацелася і самім навучыцца рабіць падобныя цуды з «белага золата», як яго называлі. Нездарма яшчэ пяць стагоддзяў таму вядомыя магнаты спрабавалі наладзіць вытворчасць фарфору ў Еўропе. Ды што там магнаты — нават каралі, як, напрыклад, Аўгуст II Моцны, які быў абраны на польскі прастол, хоць сам паходзіў з Саксоніі. Менавіта ён заклаў у Мейсене першую еўрапейскую мануфактуру па вырабе фарфору, сакрэт вытворчасці якога трымаўся ў таямніцы. Але ж варта толькі было прыдумаць... І цягам часу вытворчасць фарфору прыйшла на польскія землі — ў 1790 годзе была створана мануфактура ў Корцы, потым у Брануўцы, Тамашове і Цмелеве. Мануфактуры паўставалі там, дзе была прыдатная сыравіна для вырабу фарфору. Але найбольш актыўна справы ішлі на сілезскіх мануфактурах Прушкова, Глініцы, Рацібора, Тулавіц. На багацце калекцыі на вырабаў з гэтых месцаў звярнуў увагу беларускіх гледачоў Дамінік Абламовіч, дырэктар Верхнесілезскага музея ў Бытаме, які быў заснаваны больш за 100 гадоў таму. Сапраўды, калі ісці на гэтую выставу, трэба пачытаць прадмову да яе — каб наогул лепш зразумець, чым жа так каштоўны фарфор і якім непаўторным можа быць фаянс. Бо адкуль жа даведацца пра тое, як еўрапейцы падышлі да вытворчасці керамікі, што новага яны прынеслі ў гэтую справу, як шліфавалі тэхналогію і наколькі думалі пра мастацкасць саміх вырабаў, адметнасць іх формы.



Таму што ў кожнай з мануфактур былі свае сакрэты, свае майстры, якія дбалі пра аздобу вырабаў. А яны маглі быць не толькі тонкага фаянсу, што выраблялся са светлай гліны. Напрыклад, на мануфактуры ў Рацібора выпускалі посуд з фарбаванай карычневай ці чорнай масы. З чырвонай глінай працавалі на мануфактуры ў Тулавіцы, дзе ствараўся «чорны фарфор» (вырабы спецыяльна глазуравалі), а потым яшчэ і аздаблялі роспісам. А яшчэ посуд мог быць і з антычнымі матывамі — як умелі рабіць у Балеслаўцы. А ў Цмелеве, акрамя сервізаў, любілі рабіць розныя галантарэйныя рэчы — фарфоравыя табакеркі, сальнічкі ці нават фігуркі для інтэр'еру. Цікава даведацца, што фабрыка фарфору ў Багуціцы рабіла наборы посуду для польскіх дыпламатычных установ ужо ў XX стагоддзі. Не, усё ж фарфор — гэта з'ява сапраўды статусная. Можа быць таму, што мастацкая.

Да нас на выставу, што праходзіць у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, прывезлі 150 экспанатаў твораў керамікі (гэта фаянс сілезскіх мануфактур) з Верхнесілезскага музея ў Бытаме. Але насамрэч у калекцыі гэтага музея ёсць розныя экспанаты — археалагічныя, этнаграфічныя, гістарычныя, мастацкія (каля 1,5 мільёна прадметаў).

**Ларыса ЦІМОШЫК.**



# Максімава доля



**18 лютага 1893 года нарадзіўся пісьменнік Максім Гарэцкі. Шырыня і шматграннасць яго творчых інтарэсаў (а калі дакладней, наогул талент гэтага чалавека) не могуць не ўражваць. пісьменнік, драматург, публіцыст, літаратуразнавец, перакладчык, крытык, фалькларыст, мовазнавец, гісторык. І ўсё гэта ён — Максім Гарэцкі. У кожнай з гэтых галін «чалавеказнаўства» Максім Іванавіч не проста «адзначыўся», а пакінуў след... Свой след: адметны і непаўторны. І такім жа, уласна кажучы, быў і яго лёс, і яго, Максімава, доля...**

Ён бачыў жыццё ўвачавідкі — ва ўсіх яго шматлікіх і самых неверагодных праявах і выпрабаваннях. А галоўнай сваёй мэтай Максім лічыў паказ гэтага іншым. Ён сам бачыў святло ў цемры, разумеў і адчуваў вялікую духоўную моц беларуса, яго нераскрытую маральную сілу. Сам жа ішоў-крочыў па тым жыцці шляхам, які ён вызначыў сам для сябе, шляхам мастацкай праўдзівасці — найлепшай дарогай літаратуры нашай...

У літаратуру — вялікую і сапраўдную — ён не ўвайшоў, а ўварваўся ў прамым сэнсе гэтага слова. Хоць і былі ў ёй насцеж расчыненыя дзверы: калі ласка, пішы, заяўляй аб сабе, выдавай кніжкі. На поўную моц тварылі ўжо Янка Купала і Якуб Колас, Максім Багдановіч і Ядвігін Ш, Цішка Гартны і Алесь Гарун, але ж колькі тэм заставалася нераскрытых, некранутых і таямнічых — такіх патрэбных беларускаму тагачаснаму грамадству!

«Я жыць хачу вольным жыццём — жыццём радасці, добрага вясёлага смеху і ўсяго таго, што побач з другімі творыць гармонію жыцця!» — напішапаспавядаецца Максім Гарэцкі ў «Нашай ніве» за 16 мая 1913 года. А як дакладна назваў ён тую сваю споведзь: «Стогны душы»! Яму было ўсяго толькі дваццаць! А душа ўжо стагнала?! Ці не ранавата? Наперадзе ж жыццё: поўнае задум, планаў, здзяйсненняў. Але ж стагнала Душа Максіма...

Жыць вольным жыццём ён захацеў адразу ж, як толькі стаў на ногі.

...У 16-гадовым узросце Максім Гарэцкі ўзяў першы ў жыцці бар'ер: перамог у вялікім конкурсным адборы і стаў навучэнцам Горы-Горацкага каморніцка-агранамічнага вучылішча. Там юны Максім упершыню ўзяў у рукі «Нашу ніву», пазнаёміўся з творамі, падпісанымі Януком Купалам, Тарасам Гушчам (Якубам Коласам), Змітраком Бядулем, Алаізай Пашкевіч (Цёткай)... А потым убачыў на старонках гэтай газеты і свае першыя «пробы пяра».

Менш за год папрацаваў Гарэцкі каморнікам у Літве. Пачалася Першая сусветная вайна, і ўжо напрыканцы чэрвеня 1914-га яго мабілізавалі ў дзейную царскую армію. Ураджанні вайны, прапушчаныя праз душу і сэрца творцы, знойдуць потым адлюстраванне ў дакументальным творы М. Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне» — аповедзе пра самае нечалавечае выпрабаванне, у якім аказваецца чалавек. Твор пастаўлены крытыкай і даследчыкамі ў адзін шэраг з «Севастопальскімі апавяданнямі» і «Вайной і мірам» Л. Талстога, аповесцямі і раманамі А. Барбюса, А. Цвейга, Э.-М. Рэмарка і іншых таленавітых і непараўнальных сусветных майстроў вайсковай прозы.

...Напрыканцы кастрычніка 1923 года сям'я Гарэцкіх пераехала ў Мінск. Максім Іванавіч выкладаў на рабфаку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, актыўнічаў у літаратурным і грамадскім жыцці. На працягу 1926-1928 гадоў ён працаваў у Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, потым — вучоным спецыялістам Інстытута беларускай культуры ў Мінску. Яшчэ ранней — у студзені 1925-га — разам з Янкам Купалам, Якубам Коласам, Цішкам Гартным і іншымі майстрамі беларускай нацыянальнай культуры Максім Гарэцкі быў зацверджаны правадзейным членам (акадэмікам) Інбелкульта.

А ў сярэдзіне ліпеня 1930-га прагучаў гром з яснага неба: Максіма Гарэцкага арыштавалі і разам з іншымі выдатнымі людзьмі Бацькаўшчыны абвінавацілі ў прыналежнасці да няіснага, міфічнага «Саюза вызвалення Беларусі»... Прысуд: высылка на 5 гадоў у горад Вятку.

Пачаўся новы этап у яго жыцці. Гэта быў і новы перыяд у жыцці ўсяго грамадства. Ранейшыя нормы жыцця паступова страчвалі сваю вагу. На краіну няўхільна насоўвалася атмасфера падазронасці, страху і рэпрэсій.

Ды толькі М. Гарэцкі не быў з тых, каго можна было запалохаць ці зламаць страхам і рэпрэсіямі. Ён не лічыў сябе вінаватым, а таму адразу ўступіў у паядынак з існуючай сістэмай. Першае, чаго ён настойліва дамагаўся, было тое, каб яму вярнулі рукапісы, канфіскаваныя падчас арышту. У лістах да жонкі Л.У. Чарняўскай ён даволі часта цікавіцца тым, ці вярнулі яго рукапісы. Затым ён звярнуўся непасрэдна да кіраўніцтва дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення, хаця ўжо і ў яго самога ўзнікаюць сумненні: «І вось надоечы напісаў у Менск начальніку ГПУ, каб вярнулі мне мае затрыманыя рукапісы. Але хто там пачуе мой голас, калі я не пісьменнік, якога б нехта цаніў як пісьменніка?».

М. Гарэцкі быў адным з нямногіх беларускіх пісьменнікаў, які не адмовіўся ад актыўнай творчай працы пасля таго, як быў рэпрэсаваны. Ён імкнуўся не толькі завяршыць свае ранейшыя творы, а і расказаць пра рэальнасць 30-х гадоў. Подзвіг М. Гарэцкага ўяўляецца вельмі значным яшчэ і таму, што ён доўга не меў ніякіх умоў для творчасці. Пісьменнік з вялікімі намаганнямі спрабаваў знайсці нейкае прыстанішча, з цяжкасцю шукаў працу. Пра гэтыя свае «блуканні па пакутах» ён у хуткім часе раскажа ў «Лявоніусе Задумекусе»: «Будзеш хадзіць, будзеш шукаць і нічога не знойдзеш. Прыцягнешся ў логава сваё і па драбіне ўзлезеш на дрэва, на памост, у буду, у гняздо сваё. Пасцелеш свой чорны хітон і ляжаш. Але не заснеш...»

Пасля адбыцця тэрміну надуманага пакарання ён выкладаў рускую літаратуру і мову ў пасёлку Пясочня на Смаленшчыне, але праз два гады — у жудасным 1937-м, падчас новых масавых рэпрэсій — зноў быў арыштаваны...

... Сям'я атрымала паведамленне, што Максім Гарэцкі памёр 20 сакавіка 1939 года ў Комі АССР. На справе ж Максіма Іванавіча, як было ўстаноўлена даследчыкамі, расстралялі 10 лютага 1938 года а 15 гадзіне ў Вязьме...

Напкануй яму Усявышні болей гадоў жыцця (пражыў жа Максім Іванавіч усяго толькі 45), і ён стварыў бы яшчэ не адно панарамнае палатно беларускай рэчаіснасці. Бацькаўшчыну ж ён любіў бязмежна, тонка: з болем у душы і светлай верай у будучыню ў сэрцы адначасова...

**Людміла АКУЛЕНКА, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Курманаўскага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад — сярэдняя школа.**

**P.S.** *Людміла Ягораўна напісала цэлае даследаванне, прысвечанае Максіму Гарэцкаму. Але фармат газеты не дазваляе яго змясціць цалкам. Тым не менш, магчыма, да некаторых частак яе допісу мы яшчэ звернемся. Як і да самой асобы пісьменніка, пра якога гаварылі навукоўцы і даследчыкі на «Гарэцкіх чытаннях».*

# ПРА БЕЛАРУСЬ ПА-АНГЛІЙСКУ

**Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» прэзентавала новыя дзіцячыя кнігі на англійскай мове. У маленькіх чытачоў з'явілася магчымасць удасканаліць англійскую мову на беларускім матэрыяле. А ў замежнікаў — даведацца пра беларускую культуру і традыцыі на мове міжнацыянальных зносін.**

— Выдавецтва прапанавала перакласці беларускія, рускія і ўкраінскія казкі на англійскую мову для выставы ў Расіі і Індыі, — расказвае **перакладчык, настаўніца вышэйшай катэгорыі Соф'я РУСАКЕВІЧ.** — Мне і іншым перакладчыкам падалося гэта цікавым. Тры гады пражыўшы ў Кітаі, я разумела, што людзі цікавяцца нашай краінай, беларускімі традыцыямі і айчыннай літаратурай. Шчыра кажучы, было складана перакладаць народны фальклор. Перш чым прыступіць да працы, нам давялося прачытаць шмат твораў англамоўных аўтараў, каб улавіць стыль мовы і разам з тым не ўпусціць разынку народных казак.

Пабачылі свет зборнікі беларускіх, рускіх і ўкраінскіх народных казак «The Smartest Person» («Самы разумны»), «A Wooden House of Fairy Tales» («Церамок казак»), «A Straw Bull» («Саламяны бычок»), «Christmas Eve Fairy Tales» («Казкі пад Каляды»). У кнігах такія вядомыя казкі, як «Калабок», «Церамок», «Марозка», «Як Сцёпка з панам гаварыў»...

Не абысціся ў казках і без карцінак. Гэта добра ведае вядомы мастак-ілюстратар Сяргей Волкаў, які якраз і займаўся візуальным афармленнем кніг. Тым больш, вопыт у мастака багаты: выйшла больш за 300 кніг для дзяцей з яго ілюстрацыямі.

— Задача, якую я ставіў перад сабой пры ілюстраванні гэтых кніг, — не толькі пацешыць і развесяліць дзяцей, а і пазнаёміць іх з нацыянальнымі касцюмамі Беларусі, Расіі і Украіны, у якія якраз і апрануты мае персанажы, — прызнаўся мастак-ілюстратар. — Перш за ўсё малюнак павінен адпавядаць тэксту. Дзеці — уважлівыя чытачы, яны заўсёды заўважаюць памылкі.

Не толькі дзеці могуць пачытаць літаратуру на англійскай мове. Паклапаціліся аўтары і пра падлеткаў. Наталля Голубева спецыяльна для юнацтва напісала аповесць-фэнтэзі «The Treasures of Lake Vaal» («Скарбы возера Ваал»). Як прызналася пісьменніца, для яе праца над дзіцячай тэмай стала нечаканасцю.

— Разлавалася! Узгадала сваё дзяцінства: з году ў год мы чытаем пра Чырвоны Каптурок, пра Іванадурня, пра Калабка... Хаця ў нас ёсць шыкоўны гістарычны матэрыял. Беларусь — унікальная краіна, якая захавала такое паняцце, як духоўная культура. Кніга — фэнтэзі, напісанае на аснове гістарычнага Полацка. Я стварыла беларускі вобраз цётачкі Рут, якая жыве ў беларускай сядзібе, разам з героямі разгадвае таямніцы. Спадзяюся, што юнакам праз успрыманне лёгкага стылю, загадкі, таямнічасці, чараўніцтва будзе лягчэй спасцігнуць гісторыю сваёй краіны.

Кніга «The Enchanted World « («Чароўны свет») — перакладчыцкі дэбют маладога аўтара Наталлі Калядкі. Зборнік дае магчымасць даведацца пра родную міфалогію па-англійску.

Кнігі цудоўныя, добра перакладзеныя, прыгожа аформленыя. Аднак, што ні кажы, а ці будзе запатрабаваная такая літаратура? Сучасных дзяцей сёння цяжка прымусіць пачытаць кнігу на беларускай ці рускай мовах. Што ўжо казаць пра літаратуру на англійскай мове! Толькі ў аўтараў іншае меркаванне.

— Кніга заўсёды знойдзе свайго чытача, — перакананая **перакладчык, дацэнт Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Наталля КАЛЯДКА**. — Вядома, у гэтым павінны дапамагчы бацькі. А дзеці для ўсяго адкрыты. Таму ім будзе цікава калі не пачытаць кнігу, дык хаця б яе пагартаць.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота аўтара.**



Дэбют перакладчыцы Наталлі КАЛЯДКІ — кніга «The Enchanted World» («Чароўны свет»).

## Знаёмцеся з літаратурнымі навінкамі!

✓ «Christmas Eve Fairy Tales» («Казкі пад Каляды»). У кнізе сабраны найбольш папулярныя казкі і загадкі, прысвечаныя самому яркаму і вясёламу святу — Калядам.

✓ «The Smartest Person» («Самы разумны»). У кнігу ўвайшлі самыя вядомыя беларускія казкі на сацыяльную і бытавую тэматыку: «Стары бацька», «Шаптуха», «Пану навука», «Як мужык гусей дзяліў» і іншыя.

✓ «A wooden house of fairy tales» («Церамок казак»). Кніга ўключае рускія народныя казкі на англійскай мове: «Маша і мядзведзь», «Калабок», «Гусі-лебедзі», «Сястрыца Алёнка і братка Іванка», «Ліса і журавель» і іншыя. Казкі распавядаюць нам пра адважных і сумленных герояў, якія абараняюць слабых і бездапаможных. Яны перамагаюць сваіх ворагаў дзякуючы мудрасці і сіле, цярплівасці і руплівасці.

✓ «A Straw Bull» («Саламяны бычок»). Выданне змяшчае самыя папулярныя ўкраінскія народныя казкі: «Каласок пшаніцы», «Саламяны бычок — смаляны бачок», «Залаты чаравічак», «Лятучы карабель», «Гадкае качаня» і іншыя. У казках дабро супраціўляецца злу, працавітасць супрацьпастаўляецца ляноце, а храбрасць — баязлівасці.

✓ «The Treasures of Lake Vaal» («Скарбы возера Ваал»). Старыя землі Полацка поўныя міфаў і легендаў ... Яны тояць шмат сакрэтаў. Героі гэтай кнігі — мудрая і прыгожая Рут і яе сябры Ясь і Юрась — паспрабуюць знайсці разгадкі гэтых таямніц. Сярод іх памочнікаў Захавальнікі Зямлі, Галоўны Астраном, Галоўны Вучоны, Белы Манах, Цмок, Арол, варажэя і іншыя героі кнігі. Злая Ашэр з яе саўдзельнікамі ставяць перашкоды на іх шляху. Сябры павінны змагацца супраць злых сясцёр, Чорнага манаха, Чарнабога, Карачуна і Зюзі і супрацьстаяць ім. Чытачы даведаюцца пра дзівосныя землі, дзе цячэ Эрыдан і Палата. Разам з героямі гэтай кнігі яны будуць уцягнутыя ў цудоўнае, але небяспечнае падарожжа да старажытных скарбаў.

✓ «The Enchanted World» («Чароўны свет»). Выданне знаёміць з найбольш папулярнымі казачнымі персанажамі і вобразамі беларускай міфалогіі, якія захаваліся ў духоўнай спадчыне беларусаў да нашых дзён.

# МІХАІЛ КІКОІН НА МАЛОЙ РАДЗІМЕ

**Гомель стаў першым з абласных цэнтраў краіны, дзе экспануецца ўнікальны арт-праект «Мастакі Парыжскай школы з Беларусі». На выставе можна пазнаёміцца з шэдэўрамі мастакоў, якія нарадзіліся ў Беларусі і на пачатку XX стагоддзя эміграваў ў Францыю. Іх усіх аб'ядноўвае прыналежнасць да так званай Парыжскай школы жывапісу.**



Пісьменнік Уладзімір ГАЎРЫЛОВІЧ знаёміцца з выставай «Мастакі Парыжскай школы з Беларусі».

Гомельскі палац Румянцавых і Паскевічаў прыняў карпаратыўную калекцыю Белгазпрамбанка, для якой выдзелена тры шыкоўныя залы. Дарэчы, калекцыя пачала фарміравацца ў 2011 годзе, і цяпер банк валодае палотнамі сусветна вядомых мастакоў: Марка Шагала, Хаіма Суціна, Міхаіла Кікоіна, Восіпа Любіча, Пінхуса Крэменя, Восіпа Цадкіна, Шрага Зарфіна. Дарэчы, гэтая калекцыя прызнана самым буйным зборам работ экспрэсіяністаў Парыжскай школы не толькі ў Беларусі, але і ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе. Для жыхароў Гомеля асабліва цікава і важна пазнаёміцца з творамі земляка Міхаіла Кікоіна, які нарадзіўся на тэрыторыі вобласці (мяркуецца, у Рэчыцы) у 1892 годзе.

Дарадца старшыні ўпраўлення банка Уладзімір Сажын на адкрыцці экспазіцыі адзначыў, што іх арганізацыя працягне рэалізацыю праектаў па вяртанні культурнай спадчыны Беларусі на гістарычную радзіму. Больш за тое, не выключана, што калекцыя карцін будзе пашырацца:

— Мы надаём гэтаму праекту больш важнае значэнне — вяртанне культурнай спадчыны Беларусі на гістарычную радзіму. У гэтым аспекце калекцыя будзе пашырана не ў сэнсе дакладнага прытрымлівання назве «Мастакі Парыжскай школы з Беларусі», але з усведамленнем неабходнасці вяртання беларускіх каранёў на беларускую зямлю. Вядома, што толькі каля 3% беларускай спадчыны знаходзіцца на тэрыторыі краіны. Астатняе або рассеяна па свеце, або згублена.

У экспазіцыі арт-праекта «Мастакі Парыжскай школы з Беларусі», акрамя работ з карпаратыўнай калекцыі банка, прадстаўлены творы мастакоў Парыжскай школы з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі і збораў прыватных калекцыянераў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара**

■

# МАЙСТРЫ — ЭКСТРА-КЛАС!

## Той, хто валодае рамяством, валодае таямніцай. І гатовы ёй падзяліцца

Выставы, можа, таму і прыжыліся ў Беларусі, што ёсць людзі, якія ўмеюць рабіць рукамі цудоўныя рэчы. Імі можна карыстацца ці наталяцца прыгажосцю, мастацкасцю ды ўрэшце проста чалавечай цеплынёй, якая ёсць у кожнай такой рэчы. Дакладна, што такія вырабы будуць унікальныя, непаўторныя, за кожным будзе імя аўтара, які здолеў нават утылітарныя рэчы, якімі будуць карыстацца ў жыцці, зрабіць творамі мастацтва. Ці то гэта прадметы адзення, ці то ўпрыгожанні, цацкі, сувеніры ці дэкаратыўныя рэчы.

Нацыянальны гістарычны музей ужо не першы раз дапамагае знайсці адзін аднаго майстрам і людзям, якія не проста гатовы захапляцца іх творамі, але і хочуць навучыцца якому-небудзь рамяству самі. Напрыклад, у бліжэйшыя выхадныя разам з выставай пройдзе цэлы шэраг майстар-класаў, на якіх чаму толькі ні навучаць. А ў сучасным жыцці ж усялякія навыкі могуць спатрэбіцца, вось хоць бы дзеля таго, каб рабіць сваімі рукамі арыгінальныя падарункі сваім блізкім людзям на святы. Хочаце кветак? Дык іх можна рабіць вельмі рэалістычнымі — з гліны, якая застывае сама. Хочаце шалік з воўны ці пацеркі? Дык вам пакажуць, як іх можна зваліць. Што такое крэатыўнае вязанне ці скрабукінг? Як працаваць са скурай? Як самім зварыць мыла? Усё пакажуць цягам дзвюх дзён — 16 і 17 лютага. Для самых цікаўных ёсць нават расклад усіх майстар-класаў. А на некаторыя з іх нават адкрыты папярэдні запіс. Запатрабаваная справа, аднак...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# НАШЫ Ў ПАРЫЖЫ

**11 лютага 2013 года з нагоды дня нараджэння славутага беларускага мастака і кампазітара Напалеона Орды (1807—1883), Пасол Беларусі ў Францыі Павел Латушка і супрацоўнікі пасольства ўсклалі кветкі да памятнай дошкі, якая ўсталявана на доме ў Парыжы, дзе жыў і працаваў ў 1843-1847 гг. знакаміты дзеяч беларускай культуры.**

Парыжскі перыяд жыцця Н. Орды прынёс яму вядомасць ў шырокіх колах еўрапейскай інтэлігенцыі. Менавіта ў Францыі вызначыліся яго прыярытэты ў творчасці — музыка і жывапіс. Напалеон Орда пазнаёміўся ў Парыжы з выдатнымі дзеячамі еўрапейскай культуры — Дж. Вердзі, І. Тургеневым, А. Міцкевічам, Ф. Шапэнам, Ф. Лістам, Дж. Расіні, Ж. Гуно, Г. Берліёзам, А. дэ Бальзакам, Стэндалем, П. Віярдо. Усе гэтыя людзі аказалі вялікі ўплыў на творчасць Н.Орды. З 1847 г. ён працаваў дырэктарам Італьянскай оперы ў Парыжы.

З Парыжам таксама звязана жыццё і дзейнасць такіх знакамітых людзей, выхадцаў з Беларусі, як Марк Шагал, Міхаіл Кікоін, Хаім Суцін, Іосіф Цадкін, Адам Міцкевіч, Ігнат Дамейка, Валенцій Ваньковіч, Леў Бакст і іншыя.

**Кар. «Звязды».**



# У МАГІЛЁВЕ ЗАПАХЛА АРХІДЭЯМІ

**У абласным цэнтры адкрылася выстава архідэй: у выставачнай зале буяюць незвычайныя колеры і пахне вясной.**

Каля дзвюх соцень архідэй прадставіла на выставе аматарка гэтых экзатычных кветак Вераніка Мунцян. Маладая магіляўчанка займаецца кветкамі з дзяцінства, а гадоў пяць таму ўлюбілася ў архідэі. Яе першая архідэя — дэндробіум, з пяшчотнымі і пышнымі ружовымі кветкамі.

— Я люблю архідэі за іх прыгажосць, за незвычайныя формы і фарбы, — расказвае Вераніка. — Мне падабаецца, што яны цвітуць доўга, а нейкага спецыяльнага догляду не патрабуюць.

Архідэі, якія выстаўлены ў Магілёве, прывозяць з Галандыі. Але радзіма гэтых прыгажунь — Усходняя Азія, Цэнтральная і Паўднёвая Амерыка. Хаця архідэі растуць ва ўсім свеце: адзін з відаў дзікай архідэі зарэгістраваны нават у Чавускім раёне Магілёўскай вобласці.

Апошнімі гадамі архідэі ў нас сталі папулярныя як пакаёвыя кветкі: іх з поспехам вырошчваюць у дамах і звычайных кватэрах. Ёсць, вядома, такія віды, якія патрабуюць аранжарэйнага клімату і навыкаў спецыяліста. Аднак Вераніка Мунцян лічыць, што мець архідэю пад сілу і навічку: для гэтага трэба набыць фаленопсіс — адаптаваны да нашых умоў і таму самы распаўсюджаны ў нашых кветкавых крамах від архідэі.

На выставе ў Магілёве іх шмат: маленькія і вялікія, белыя, як нявесты, самых розных адценняў ружовага і жоўтага, любімага колеру знакамітага нью-ёркскага дэтэктыва і вялікага аматара архідэй Ніра Вульфа, героя раманаў Рэкса Стаўта. Ёсць тут архідэі неверагоднай «тыгрынай» расфарбоўкі, а таксама ў крапінку, плямы і палоскі. Кошт гэтых прыгажунь — ад 100 да 250 тысяч рублёў.

На выставе можна адразу атрымаць і кансультацыю па доглядзе за архідэямі. Ганне Івановай, сяброўцы гаспадыні выставы, яшчэ не так даўно не ўдавалася пасябраваць і з фіялкамі, але год таму выпадкова яна набыла архідэю (дарэчы, бардовы фаленопсіс) і стала вялікай аматаркай. Цяпер у яе 3-пакаёвай кватэры 76 (!) архідэй, і маладая жанчына захапілася так званымі «прыроднікамі». Выпісвае з заказнікаў парасткі рэдкіх архідэй, літаральна гадуе іх і потым бясконца радуецца іх цвіценню.



— Яны дораць мне станоўчыя эмоцыі, я жыву гэтым, — спрабуе растлумачыць сваё стаўленне да кветак Ганна. — Мне падаецца, што ў архідэй ёсць душа!

Яна, дарэчы, з дзяцінства ў інваліднай калясцы, але абмежаваныя магчымасці зусім не перашкодзілі Ганне Івановай стаць не проста жыццярадасным чалавекам, але атрымаць прафесію эканаміста. А цяпер яна яшчэ і спецыяліст па вырошчванні архідэй. А перасоўваць гаршкі з кветкамі ёй пачынае дапамагаць 2-гадовы сын Матвей! Хутка, напэўна, і хлопчык зможа тлумачыць наведвальнікам наступнай выставы: «Для архідэі важна святло, свежае паветра, вада і падкормка, а таксама любоў!»

— Зімою нам не хапае сонца і яркіх фарбаў, таму да нас можна прыходзіць проста для ўзняцця настрою, — усміхаецца Вераніка. — Гэтая прыгажосць палепшыць ваш дзень!

**Ілона ІВАНОВА.**
**Фота аўтара.**








■ Зорная рана зямлі

## 40 мільёнаў гадоў таму...

**40 мільёнаў гадоў таму на Лагойшчыне «прызямліўся» метэарыт.**

Здавалася, нішто не прадказвала бяду: свяціла сонца, на беразе марской лагуны грэліся трапічныя жывёлы. Раптам на небе з'явіўся велізарны вогненны шар, які з неймавернай хуткасцю набліжаўся да зямлі. Невядомы касмічны госць урэзаўся ў марскі бераг з такой сілай, што, здавалася, прасвідраваў зямныя нетры. Ад выбуху страсянулася наваколле, а рэха разнеслася на сотні кіламетраў. Высокія хвалі-цунамі хлынулі на бераг. Яны паглыналі на сваім шляху ўсё жывое.

Гэткія жахі гледачы назіраюць у галівудскіх фільмах. Але прыкладна такі апакаліпсіс адбыўся калісьці на тэрыторыі сучаснай Лагойшчыны. Паміж Лагойскам і Плешчаніцамі, паблізу вёсак Кузевічы і Лагаза ўпаў метэарыт, які меў звыш 600 метраў у дыяметры і вагу да 500 млн тон. Нёсся астэроід да Зямлі з хуткасцю 18 кіламетраў у секунду. Магутнасць выбуху перавышала магутнасць скінутай на Хірасіму атамнай бомбы ў 10 тысяч разоў. У выніку ўтварыўся кратар даўжынёй і шырынёй адпаведна да 15 і 11 кіламетраў і глыбінёй 1000 метраў.

Здарылася гэтая трагедыя ў эпоху сярэдняга палеагену. На той час на зямлі панаваў камфортны трапічны клімат, а тэрыторыю Еўропы пакрывалі вечназялёныя лясы. Цяжка нават уявіць, што на поўдні нашай краіны, у тым ліку і на Лагойшчыне, плёскаліся хвалі цёплага пяшчотнага мора, а на яго берагах і ў засені раскідзістых дрэў сяліліся млекакормячыя і драпежныя птушкі: у гэты перыяд рэптыліі практычна вымерлі, і іх нішу пачалі займаць новыя віды жывёл. Выбуховая хваля знішчыла ўсё жывое на дзясяткі, можа нават і сотні кіламетраў, сонца закрылі пыл і попел, зямля пагрузілася ў цемру на многа месяцаў. У хуткім часе кратар запоўніўся вадой і пераўтварыўся ў глыбокае, правільнай круглай формы, возера. Цяпер мала што нагадвае, што ў далёкім мінулым тут адбылася касмічная катастрофа. Вадаём зарос асакой, чаротам і стаў звычайным балотам, якое часткова асушана. А сам кратар можна ўбачыць толькі з дапамогай аэраздымак. Справа ў тым, што па тэрыторыі Беларусі неаднаразова праходзілі скандынаўскія ледавікі. Яны і залячылі рану, нанесеную зямлі касмічным госцем. Разам з тым, як сцвярджаюць жыхары Кузевіч, да сённяшняга дня гэтая зона з'яўляецца, так бы мовіць, асаблівай, паколькі тут адбываюцца незразумелыя рэчы. Аднойчы пры моцнай навальніцы невядомая сіла паваліла тэлефонныя слупы. А яшчэ мне па сакрэце паведамілі, што на дне кратара, пад 200-метровым напластаваннем, захоўваецца багаты скарб — алмазы, што ўтварыліся пры сутыкненні зорнага прышэльца з зямлёй. Ды гэтую байку развеяла студэнтка Алена — будучы геолаг: сапраўды, гэтыя каштоўныя «каменьчыкі» прысутнічаюць у мікраскапічным пыле, але ў такой нязначнай колькасці, што сабраць іх немагчыма. Разам з тым лагайчане ганарацца, што «госць», які калісьці «прызямліўся» ў іх раёне, самы буйны на тэрыторыі краін СНД, і яго ахрысцілі касмічным братам Тунгускага метэарыта.

Месца падзення астэроіда выявілі выпадкова. У сярэдзіне 70-х гадоў мінулага стагоддзя паміж Лагойскам і Плешчаніцамі вяліся планавыя геалагічныя работы з бурэннем свідравін. Нечакана ў адным з пластоў былі заўважаны неўласцівыя для рэгіёна пароды. Іх дасканала абследавалі масцітыя акадэмікі, спецыялісты — выказваліся розныя здагадкі, меркаванні. З вядучым навуковым супрацоўнікам Інстытута геалагічных навук Нацыянальнай акадэміі навук Мікалаем Вераценнікавым, які сцвярджаў, што гэта метэарытны кратар, доўгі час не пагаджаліся. Але ўрэшце вымушаны былі прыняць яго трактоўку.

У Беларусі афіцыйна зарэгістравана пяць метэарытаў, факт падзення якіх неаспрэчны. Адзін з іх знойдзены ў Слуцкім раёне ў 1954 годзе і вядомы пад назвай Грэск. Яго вага 300 кілаграмаў. Другі (дакладней, яго асколкі агульнай масай больш за 800 кілаграмаў) «прызямліўся» ў пазамінулым стагоддзі ў Брагінскім раёне. Невялікія каменныя метэарыты былі выяўлены таксама ў Столінскім, Івацэвіцкім і Быхаўскім раёнах.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

Вольга ПАНАРЫНА, чэмпіёнка Еўропы-2012 па веласпорце:

# «СПАЧАТКУ НАВУЧЫЛАСЯ КРУЦІЦЬ ПЕДАЛІ І ТОЛЬКІ ПОТЫМ — ХАДЗІЦЬ»



**Менш чым праз тыдзень у Мінску стартуе чэмпіянат свету па веласпорце на трэку. На жаль, напярэдадні спаборніцтваў наша жаночая каманда панесла сур'ёзныя страты. Спачатку ад удзелу ў сусветным першынстве адхілілі нядаўнюю чэмпіёнку Еўропы Таццяну Шаракаву, па справе якой зараз вядзецца допінгавае расследаванне. Не выйдзе на веладром «Мінск-Арэны» і Вольга Панарына. Чаму адна з лідараў нашай каманды вымушана прапусціць хатні чэмпіянат, калі пачынаеш цаніць жыццё і наколькі цяжка быць спартсменам, карэспандэнту «Звязды» распавяла шматразовая прызёрка чэмпіянатаў свету і Еўропы Вольга Панарына.**

## «СА ЗДАРОЎЕМ НЕ ЖАРТУЮЦЬ!»

**— Вольга, як атрымалася, што вы прапускаеце такі доўгачаканы і важны старт?**

— На вялікі жаль, стан здароўя не дазваляе. У мяне выявілі кісту ў галаўным мозгу, напэўна, гэта і ёсць асноўная праблема. Як толькі атрымліваю сур'ёзныя фізічныя нагрузкі, пачынаюцца моцныя болі ў галаве. Ведаеце, з такім не жартуюць.

**— А калі пачаліся гэтыя праблемы?**

— За месяц да Алімпіяды. Было даволі сур'ёзнае падзенне на трэку. Абышлося без чэрапна-мазгавой траўмы. Але ўжо на наступнай трэніроўцы я адчула боль. Тут жа пачалі праводзіць тэрапію. І, безумоўна, я працягвала працаваць... на абязбольвальных таблетках. Спадзявалася, што лячэнне дапаможа. Але змяняліся прэпараты, уколы, а болі так і заставаліся.

**— Што зараз кажуць урачы?**

— Тут увогуле склалася не зразумелая для мяне сітуацыя. Спачатку дактары наперабой паўтаралі, што трэба абавязкова лячыцца, класціся ў бальніцу, абследавацца, паляжаць пад кропельніцамі. Адзін урач увогуле сказаў, што, хутчэй за ўсё, прыйдзецца завязваць са спортам. А калі нядаўна была камісія, усе дактары аднагалосна прызналі мяне цалкам здаровай. Шчыра кажучы, я разгубілася. На руках даныя абследаванняў, якія пацвярджаюць, што ёсць праблемы, а мне кажуць «здаровая». Дагэтуль не ведаю, што рабіць, хоць ты з юрыстамі райся.

**— І ўсё ж такі, якія вашы далейшыя дзеянні?**

— Хутчэй за ўсё, буду лячыцца за мяжой, раз тут сутыкнулася з такой невытлумачальнай сітуацыяй. Трэнер абяцаў дапамагчы знайсці спецыяліста ў Маскве. А там будзе відаць. Не ведаю, на колькі магу выпасці з трэніровачнага працэсу — ад месяца да паўгода. А можа, і ўвогуле давядзецца завяршаць кар'еру. Ведаю адно: калі будзе рызыка для жыцця, пакіну спорт без роздумаў.

**— Наколькі я ведаю, нягледзячы на праблемы са здароўем, зараз вы трэніруецеся разам з камандай?**

— Так, безумоўна. Нельга губляць форму. Усе аэробныя нагрузкі я выконваю, як і належыць. А вось выходзіць на трэк пакуль не гатова.

## «БАЮСЯ КУПЛЯЦЬ "РЭД БУЛ"»

**— Псіхалагічна не надламала, што давядзецца прапускаць хатні чэмпіянат свету?**

— Хвалюе, хутчэй, іншае. Умовы для падрыхтоўкі да спаборніцтваў дрэнныя. Тры месяцы таму ў нас быў запланаваны збор, але з-за недахопу сродкаў выехаць не атрымалася. Потым нас адправілі ў Сочы, але зараз гэта не лепшае месца для збораў: паўсюль будоўля, пыл, няма чым дыхаць, дарогі разбітыя, заторы, ДАІ ўвесь час зганяла нас з трасы. У выніку ў нас быў толькі адзін добры сямнаццацідзённы збор, дзе ўсё было якасна — арганізацыя, харчаванне, камфортныя ўмовы. Але гэтага недастаткова, каб падрыхтавацца да спаборніцтваў такога ўзроўню.







**— Сітуацыя, у якую трапіла Таццяна Шаракова, на вас неяк паўплывала (у яе крыві знайшлі забароненае рэчыва, якое трапіла ў арганізм са спрэем ад насмарку. — Аўт.)?**

— Напэўна, гэта зрабіла мяне больш асцярожнай. Ведаеце, ужо баішся купіць у краме энергетык накшталт «Рэд Була» *(смяецца)*. Гэты выпадак паказаў яшчэ раз, якім трэба быць уважлівым. Лепш некалькі разоў пераправерыць прэпараты, якія ты прымаеш.

**— А за допінгавым скандалам, які разгарнуўся вакол легендарнага велагоншчыка Лэнса Армстранга, сочыце?**

— Безумоўна, гэта ўсё на слыху. Але я стараюся не даваць сваю ацэнку сітуацыі, бо гэта вельмі цяжка. Мне здаецца, што меркаваць толькі па той інфармацыі, якая падаецца ў СМІ, няправільна. Я добра ведаю спартыўную «кухню» і таму разумею, што многае можа заставацца за шырмай.

## «Я ЧАЛАВЕК СТАДЫЁНАЎ!»

**— Давайце ўспомнім, як вы пачыналі сваю спартыўную кар'еру і як апынуліся ў Беларусі.**

— Мая маці раней была трэнерам па веласпорце, таму застацца абыякавай да гэтага віду спорту я ніяк не магла. З двух гадоў памятаю колы, гонкі... *(усміхаецца)* Але не мама мяне прывяла ў веласпорт. Я неяк гуляла па парку ў родным Харкаве і ўбачыла, як трэніруюцца на бетонным велатрэку. Мяне гэта зацікавіла, я падышла да трэнера і запісалася ў секцыю. Але пасля таго як не стала майго першага трэнера, у маёй спартыўнай кар'еры насталі нялёгкія часы. Паступова трэніравацца ва Украіне стала немагчыма, не магла знайсці спецыялістаў, з якімі мне было б камфортна працаваць. Тады вырашыла сама змяніць свой лёс. Мне параілі звярнуцца да расійскага трэнера Станіслава Салаўёва. Знайшла нумар, патэлефанавала, дамовіліся пра сустрэчу, на наступны дзень купіла білет у Маскву — і наперад. На той момант Салаўёў трэніраваў Наталлю Цылінскую, таму ў Мінску ўжо быў «сваім». Станіслаў Васільевіч і параіў перайсці пад сцяг Беларусі. У мяне была настолькі вялікая любоў да спорту і жаданне рэалізаваць сябе, што я, не разважаючы, прыняла гэту прапанову.

**— Як прайшоў пераезд у новую краіну?**

— Вядома, гэта быў сур'ёзны крок і спачатку давялося вырашаць шмат праблем. Але жыццё спартсмена ўвогуле складаная штука. Калі ідзеш да высокіх вынікаў, жывеш, як расліна. Трэніроўка, харчаванне, адпачынак, трэніроўка, харчаванне, адпачынак, сон... Ты ведаеш толькі два словы — «графік» і «рэжым». Любое адхіленне ўбок адразу прыводзіць да паніжэння вынікаў. Я разумела, што пасля пераходу ў іншую краіну мне прыйдзецца працаваць яшчэ больш, але была гатова аддаваць увесь свой час і сілы спорту. І ўжо праз паўтара года выйшла на новы для сябе ўзровень, пачала прывозіць медалі з буйных спаборніцтваў, а дагэтуль нават не адбіралася на вырашальныя заезды.

**— У вас гомельская прапіска. Атрымліваецца, Мінск не па душы?**

— Ды не. Проста так атрымалася, што менавіта ў Гомелі мне афармілі прапіску і ўсе астатнія дакументы, звязаныя с грамадзянствам. Ведаеце, у мяне няма прывязкі да канкрэтнага месца, невялікі гэта горад ці сталіца — няважна. Напэўна, таму, што я не чалавек гарадоў, а чалавек стадыёнаў *(смяецца)*. Я ў сваім жыцці, акрамя стадыёнаў, мала чаго бачыла, нягледзячы на тое, што мы шмат ездзім па свеце. Але ўсюды карціна адна і тая ж — аэрапорт, гасцініца, велатрэк.

**— Прагуляцца па алімпійскім Лондане таксама не ўдалося?**

— Так. Толькі ў апошні дзень выбраліся за межы алімпійскай вёскі, каб купіць сувеніры.

## АЛІМПІЙСКАЯ КАЗКА

**— Звычайна, чым маладзей спартсмен, тым лягчэй яму дасягнуць выдатных вынікаў. Але ў веласпорце шмат выпадкаў, калі ў поўнай меры раскрываюцца ў даволі сталым узросце. У чым парадокс?**

— Я не назвала б гэта парадоксам. У любым відзе спорту, які звязаны з хуткасцю, ёсць падобная залежнасць: чым карацейшая дыстанцыя, тым больш сіл трэба прыкладваць, каб пераадолець яе за прымальныя секунды. Зразумела, што з узростам спрынтарам цяжка заставацца на высокім узроўні, таму некаторыя спартсмены пераходзяць на іншыя дыстанцыі. Яскравы прыклад — амерыканка Джэні Рыд. У апошнім алімпійскім цыкле яна паказвала добрыя вынікі ў спрынце, але на Алімпіядзе ў Лондане засяродзілася на доўгіх дыстанцыях і з камандай заваявала медалі ў гонцы з пераследаваннем. Яшчэ адзін прыклад — алімпійская чэмпіёнка Вольга Слюсарава, якая таксама са спрынтаршы стала спецыялістам у доўгіх дыстанцыях.

**— Ёсць калегі, якімі вы шчыра захапляецеся?**

— Усімі алімпійскімі чэмпіёнкамі... Анна Мірс, Вікторыя Пэндлтан. Яны сапраўды выдатныя спартсменкі і яркія асобы. Вельмі цікава сачыць за іх выступленнямі. Гэта тыя людзі, з якіх хочацца браць прыклад.

**— Дарэчы, пасля Алімпіяды Вікторыя Пэндлтан вырашыла завяршыць спартыўную кар'еру. Як думаеце, ці змагла б брытанка яшчэ скарыць нейкія вяршыні? Ці яна сапраўды дасягнула ўсяго, чаго магла?**

— Цяжка адказаць на гэта пытанне. Калі спартсмен пакідае спорт, значыць на гэта ёсць свае прычыны. Безумоўна, шкада, што Віка больш не выйдзе на велатрэк, але ў спорце, напэўна, як і ўсюды, незаменных няма. З сыходам заслужаных чэмпіёнаў развіццё спорту не спыняецца, з'яўляюцца новыя зоркі, не менш таленавітыя і здольныя. Паглядзіце на французскую каманду, якая штогод папаўняецца выдатнымі спартсменкамі. Ці ўзяць немку Крысціну Фогель, якая ў дваццаць два гады стала алімпійскай чэмпіёнкай. Ёсць каму рабіць будучыню веласпорту.

**— А ў вас які самы яркі ўспамін застаўся ад Алімпіяды?**

— Алімпіяда цалкам была для мяне казкай. Там такая атмасфера!..

Калі разумееш, што тут сабраліся ўсе наймацнейшыя спартсмены планеты, цябе захліствае. Гэта проста не перадаць словамі. Безумоўна, шкада, што не ўдалося паказаць свой вынік. Але Лондан я пакідала з баявым настроем на наступны алімпійскі цыкл. Што датычыцца самага запамінальнага моманту, то ў памяці застаўся фінал спрынту. Тая барацьба паміж Аннай Мірс і Вікторыяй Пэндлтан вартая таго, каб імкнуцца да такой жа язды.

**Я добра ведаю спартыўную «кухню» і таму разумею, што многае можа заставацца за шырмай.**

## «ВЕЛАСПОРТ Я ВЫБРАЛА СЭРЦАМ»

**— На вашу думку, ёсць нейкія асабістыя якасці, якія адрозніваюць спартсмена ад звычайнага чалавека?**

— Не думаю. Спартсмены таксама звычайныя людзі. Тыя рысы, якімі надзелены чэмпіёны — мэтанакіраванасць, амбіцыйнасць, устойлівасць, усё гэта можа быць і ў людзях іншых прафесій. Такія якасці ўвогуле аб'ядноўваюць усіх лідараў і пераможцаў, людзей, якія дасягнулі пэўных вышынь у сваёй справе.

**— А вы моцна змяніліся з тае пары, як пачалі прафесійна займацца веласпортам?**

— Змянілася, таму што вырасла *(усміхаецца)*. Я заўсёды ставілася да веласпорту вельмі сур'ёзна. У нас дома бывалі моманты, калі не было чаго есці, і спорт падганяў мяне працаваць, я вельмі рана зразумела, што гэта мой хлеб. З тае пары ў маім стаўленні да працы нічога не змянілася.

**— Бацькі не хацелі перанакіраваць вас у іншае рэчышча?**

— Маці вельмі доўга спадзявалася, што па жыцці я пайду іншым шляхам, тым больш што я заўсёды выдатна вучылася і варыянтаў для будучыні, напэўна, было нямала. Як трэнер, матуля разумела, што значыць веласпорт, якія гэта нагрузкі, траўмы... Але пасля дванаццаці гадоў я ўжо не ўяўляла для сябе ніякага іншага лёсу, акрамя лёсу велагоншчыцы. Бацькам прыйшлося зразумець і прыняць мой выбар.

**— А ў раннім дзяцінстве кім хацелі стаць?**

— Урачом, настаўніцай... Звычайныя дзявочыя мары.

**— Балерынай?**

— Не-е-е. Хоць давялося пахадзіць і на ўрокі харэаграфіі. Але хутка зразумела, што ўсе гэтыя пазіцыі, работа каля станка — зусім не маё. А яшчэ некалькі месяцаў займалася мастацкай гімнастыкай. Я была даволі высокая, худая, па ўсіх параметрах падыходзіла, вось мяне і ўзялі. Нас так добра расцягвалі, што я да гэтай пары без размінкі магу сесці на шпагат. Але гэта было так балюча! Хадзіць нават было цяжка. Не вытрымала і кінула.

**— Хіба ў веласпорце менш болю? Самі ж казалі: падзенні, траўмы...**

— Так і ёсць. Але ведаеце... тое, што не атрымалася з іншымі відамі спорту, значыць так і павінна было здарыцца. Веласпорт я выбрала сэрцам. Напэўна, гэта цяжка зразумець. Калі ты яшчэ хадзіць толкам не ўмееш, а ўжо круціш педалі.... Які ж тут можа быць выбар?! А да болі, траўмаў, стомленасці прывыкаеш. Калі пачынала займацца веласпортам, былі такія падзенні, што губляла прытомнасць, потым не магла чагосьці ўспомніць. Але ніякага страху не было. Дакладней, быў, але страх не за жыццё. Проста не хацелася зноў адчуваць боль. А тое, што можна ўпасці і больш не ўстаць, тады і ў галаву не магло прыйсці. Каштоўнасць жыцця пачынаеш разумець значна пазней. Пасля трагедыі з Палінай Жук (у маі мінулага года беларуская велагоншчыца разбілася на спаборніцтвах у Туле. — **Аўт.**), я доўга не магла ачуцца. Псіхалагічна цяжка было выходзіць на велатрэк, баялася рабіць рызыкоўныя манеўры. Мабыць, таму і «завалiла» Алімпіяду. Цяпер, вядома, ужо лягчэй, час сапраўды лечыць, але цалкам тыя перажыванні наўрад ці забудуцца.

**— Кім бачыце сябе праз дзесяць гадоў?**

— Трэнерам.

**— Хочаце ўзгадаваць чэмпіёна?**

— Мабыць, такая мэта і з'явіцца пасля некалькіх гадоў трэнерскай дзейнасці. А пакуль мне проста цікава назіраць, як людзі растуць, змяняюцца. Мяне зачароўвае сам працэс, калі ў спорт прыходзяць навічкі і паступова, паступова, праз нейкі час ператвараюцца ў прафесіяналаў. Хочацца стаць часткай гэтага і дапамагчы камунебудзь дасягнуць сваёй мары.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

27 марта 2013 г. в 9.00 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Костюковичский леспромхоз».

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2012 год и основные направления деятельности общества в 2013 г.
2. Отчет совета директоров общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков общества за 2012 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков общества за 2012 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2013 году и первом квартале 2014 г.
6. О материальном вознаграждении членов совета директоров и ревизионной комиссии общества.
7. Избрание членов совета директоров и ревизионной комиссии.

Местонахождение ОАО «Костюковичский леспромхоз»: 213640, Могилевская обл., г. Костюковичи, ул. Бахарева, 11а.

Место проведения собрания: 213640, Могилевская обл., г. Костюковичи, ул. Бахарева, 11а.

Время регистрации в день проведения собрания с 8.30 до 9.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 15.03.2013 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров. *УНП 700160680*

**Считать недействительными** страховые полисы филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Бресте: Квитанция 1СУ серия КС с № 3922238 по № 3922250. *УНП 100706519*

29 марта 2013 г. в 15.00 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2012 год и основные направления деятельности общества в 2013 г.
2. Отчет совета директоров общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков общества за 2012 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков общества за 2012 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2013 году и первом квартале 2014 г.
6. О материальном вознаграждении членов совета директоров и ревизионной комиссии общества.
7. Избрание членов совета директоров и ревизионной комиссии.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 14.30 до 15.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 15.03.2013 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров. *УНП 200050191*

28 марта 2013 г. в 16.00 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Элегант».

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2012 год и основные направления деятельности общества в 2013 г.
2. Отчет наблюдательного совета общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков общества за 2012 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков общества за 2012 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2013 г. и первом квартале 2014 г.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О приобретении акций ОАО «Элегант» на баланс общества.

Местонахождение ОАО «Элегант»: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13.

Время регистрации в день проведения собрания с 15.30 до 16.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 13.03.2013 г. (с 14.00 до 17.00) по месту нахождения общества.

*УНП 400078331* Наблюдательный совет.

**УП «Минский городской центр недвижимости»**

**ИЗВЕЩАЕТ**

